СМАК АЙЧЫННАЙ ВАДЫ 5

ТКАЦТВА Ў СУЧАСНЫМ ІНТЭР'ЕРЫ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

25 КАСТРЫЧНІКА 2022 г. АЎТОРАК № 209 (29831)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«Прайшло крыху больш за 20 дзён з моманту ўвядзення ў краіне добраахвотнага страхавання дадатковай накапляльнай пенсіі, і мы маем па факце больш за тры тысячы дагавораў. Прыкладна 80 працэнтаў — рэальны сектар і 20 працэнтаў — работнікі бюджэтнага сектара. Жанчыны аказаліся больш актыўнымі: 60 % з гэтых трох тысяч — менавіта жанчыны. Больш актыўна ўключаюцца работнікі, старэйшыя за 40 гадоў. Самаму маладому чалавеку, які заключыў такі дагавор, 19 гадоў, ён абраў тарыф «5 плюс 3». Растлумачу на прыкладзе класічнай формулы «3 плюс 3» (тры працэнты плаціць работнік і тры працэнты — наймальнік), у якім памеры можна атрымаць прыбаўку да пенсіі. Калі чалавек выбірае пасля выхаду на пенсію атрымліваць суму на працягу пяці гадоў, — гэта 660 рублёў дадатковай пенсіі. Калі ён выбірае атрымліваць такую пенсію да асноўнай дзяржаўнай на працягу дзесяці гадоў, гэта 330 рублёў».

Журавіны спелыя пайшлі

Фота БелТА.

Завяршае ўборку журавін адкрытае акцыянернае таварыства «Палескія журавіны», што ў Пінскім раёне. Тут, на тэрыторыі плошчай 66 га размешчана 72 чэкі (палі). Частка палёў выкарыстоўваецца пад вырошчванне ўраджаю, частка сёлета знаходзіцца ў рэканструкцыі. З аднаго чэка збіраюць да пяці тон ягады. Частка ўраджаю з поспехам рэалізуецца на знешніх рынках.

Закон ёсць закон

ДАХОДЫ І РАСХОДЫ

Каго можа праверыць падатковая інспекцыя?

Калі вы не ўладальнік фірмы, не індывідуальны прадпрымальнік, а проста наёмны работнік — прыватнага прадпрыемства або так званы бюджэтнік — хутчэй за ўсё, змяненне падатковага заканадаўства ў самым канцы мінулага года не выклікала ў вас жадання дэталёва азнаёміцца з яго нюансамі. Тым часам, новаўвядзенні ў падатковым заканадаўстве закранулі ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь — уключаючы фізічных асоб.

СТАР. 3

Смакуй сваё!

АД ПАЛАНЭЗА ДА ЗАВЕІ

Карэспандэнт «Звязды» наведала кірмаш-дэгустацыю сартоў яблыкаў і груш

На сталах — пранумараваныя плеценыя вазы з прыгожымі адборнымі пладамі. Усяго дваццаць сартоў яблыкаў і груш — па дзесяць адных і другіх — і ўсе з іх можна прадэгуставаць. Наразалі іх супрацоўнікі РУП «Інстытут пладаводства», які днямі зладзіў дэгустацыю сваіх калекцый.

«ХОЧАЦЦА САМЫЯ-САМЫЯ...»

На пачатку дэгустацыі зялёная палатка Інстытута пладаводства нагадвала сапраўдны вулей. Ахвотных пакаштаваць плады з калекцыі было столькі, што прабіцца да талерак з нарэзанымі яблыкамі і грушамі было не так проста. Асабіста мне запомніўся мужчына, які спачатку сам смакаваў па чарзе кожны сорт, а потым упадабаныя нёс жонцы, якая стаяла ўбаку ў боціках на абцасіках. Маўляў, «вось гэтая такая смачная грушка, пакаштуй».

СТАР. 7

КАРОТКА

• Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка павіншаваў супрацоўнікаў, афіцэраў, служачых і ветэранаў з днём утварэння Службы бяспекі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

• Ансамблю «Песняры» прысвоена званне заслужанага калектыву Беларусі.

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Крытэрый адзін — не толькі буквар эканамічны (які мы ўсе вывучалі), але і ад жыцця»

Рабочы тыдзень у Палацы Незалежнасці пачаўся з абмеркавання сітуацыі ў банкаўскай сферы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам старшыню праўлення Нацыянальнага банка Паўла Калаура. У рабочай сустрэчы таксама прынялі ўдзел першы віцэ-прэм'ер Мікалай Снапкоў, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Ермаловіч і памочнік Прэзідэнта Валерый Бельскі. Кіраўнік дзяржавы адразу акрэсліў асноўныя пытанні, якія «сёння на слыху і хвалююць дзяржаву ў цэлым».

САНКЦЫІ, ВАЛЮТА І ДАСТУПНАСЦЬ КРЭДЫТАЎ

Першы з іх — санкцыі. «Уведзены беспрэцэдэнтныя санкцыі. Год фактычна прапрацавалі ў гэтым рэжыме. Трэба аддаць належнае і эканоміцы, і асабліва банкаўскай сістэме — мы вытрымалі гэтыя санкцыі. Але, як я казаў, супакойвацца ні ў якім разе нельга», — адзначыў Прэзідэнт. Ён запытаў, як банкаўская сістэма рэагавала на беспрэцэдэнтны агрэсіўны санкцыйны ціск? Як была мабілізавана банкаўская сістэма?

Другое вельмі важнае пытанне, якое, па словах кіраўніка дзяржавы, мы, здаецца, пераадольваем — меры па забеспячэнні разлікаў суб'ектаў гаспадарання па знешнегандлёвых аперацыях. «Бо сітуацыя ў гэтым плане ўскладнілася. І тут не ад нас залежыць. Тут больш залежыць ад нашых партнёраў, замежных банкаў. Тым не менш быццам бы спраўляемся. Але ёсць асобныя моманты, я гэта адчуваю, бываючы на канкрэтных прадпрыемствах, калі яны просяць аб дапамозе. Таму хацелася б пачуць адказы і на пытанні, як мы тут спраўляемся», — акрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Трэцім пытаннем на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы сталі экспартна-імпартныя аперацыі. Прэзідэнт заўважыў, што 75 працэнтаў і больш разлікаў у свеце ажыццяўляецца з выкарыстаннем долара і еўра. Гэтыя валюты ён назваў «таксічнымі» для нас.

«Рэальны сектар эканомікі — агульная праблема, адвечная праблема. Нацыянальны банк спрабуе праводзіць больш жорсткую палітыку. Урад, суб'екты гаспадарання, каб яна была мякчэйшая», — сказаў беларускі лідар. Пытанне даступнасці крэдытаў кіраўнік дзяржавы назваў цэнтральным пытаннем. Гэта датычыцца падтрымкі рэальнага сектара эканомікі. Гэта тэма таксама была вынесена на парадак дня рабочай сустрэчы.

Прэзідэнт нагадаў, што ў свой час Беларусь была ініцыятарам пэўных навацый у развіцці банкаўскай сістэмы. Гэта сістэмы Белкарт, АРІП, сістэма перадачы фінансавай інфармацыі, сэрвісы імгненных плацяжоў. Ён пацікавіўся, як сёння ідуць справы ў гэтай сферы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на міжнароднае супрацоўніцтва: «Зразумела, што будучыня за Азіяй і парадак дня сусветнага развіцця сёння задае Азія. Гэты напрамак трэба трымаць у фокусе ўвагі. Як у нас развіваецца сітуацыя ў супрацоўніцтве з азіяцкімі банкамі, з азіяцкімі эканамічнымі суб'ектамі? Якія робяцца крокі Нацыянальным банкам у сувязі з перабудовай усёй сусветнай гаспадаркі на Азію? Пытанне ў часе. Ці не прапускаем мы тут час».

Важным пытаннем рабочай сустрэчы стала інфляцыя. Прэзідэнт падкрэсліў, што інфляцыя шмат у чым залежыць ад Нацыянальнага банка. Але не ва ўсім. «Па буквары эканамічным або фінансавым — гэта пытанне Нацыянальнага банка. Інфляцыя — гэта рост цэн, інфляцыя — пытанне ўсіх узроўняў улады краіны. Вядома, Нацыянальны банк тут — традыцыйна вызначальная структура. Не будзем ад гэтага адмаўляцца», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ацэнкай Нацыянальным банкам сітуацыі з інфляцыяй. І назваў адзіны крытэрый: «Крытэрый адзін — не толькі буквар эканамічны (які мы ўсе вывучалі), але і ад жыцця. Усе дасведчаныя людзі».

З НЯПРОСТАЙ СІТУАЦЫЯЙ ГОДНА СПРАВІЛІСЯ

У сваім дакладзе Павел Калаур расказаў, што мабілізацыя банкаўскай сістэмы мела пад сабой некалькіх ключавых задач. Першая — адаптацыя самой банкаўскай сістэмы да новых рэалій. А другая — забяспечыць фінансавую стабільнасць на рынках і пры гэтым дапамагчы адаптавацца да новых рэалій нашым прадпрыемствам, рэальнаму сектару эканомікі. «Вось, уласна кажучы, па двух гэтых каналах мы працавалі. Калі была сітуацыя рэальна складаная — хаваць не будзем, мы літаральна адзін раз на тыдзень абмяркоўвалі, вызначаліся, што можа і што павінна рабіць банкаўская сістэма. І, такім чынам, з той нялёгкай сітуацыяй, лічу, вельмі годна справіліся», — адзначыў старшыня праўлення Нацбанка.

На гэта Прэзідэнт заўважыў, што справіліся, не толькі дзякуючы прафесіяналізму банкаўскіх працаўнікоў. Па яго словах, былі і знешнія фактары, якія вымушалі актыўна дзейнічаць і знаходзіць шляхі вырашэння праблем. «Не ўсе ж мы такія вялікія аказаліся. Напэўна, у свеце адбывалася не толькі негатыўнае. Але і нейкі негатыў, па-мойму, дапамог нам справіцца», — адзначыў ён.

Валерыя СЦЯЦКО.

❍ Каментарый у тэму

«Адказную палітыку мы будзем праводзіць і надалей»

Пасля дакладу ў Прэзідэнта Павел Калаур сустрэўся з журналістамі. Размову пачалі з «адвечнай праблемы» — рэальнага сектара эканомікі і даступнасці крэдытаў. Гэта пытанне пастаянна знаходзіцца ў полі зроку і ўрада, і Нацыянальнага банка. І яно абмяркоўвалася з кіраўніком дзяржавы. Павел Калаур падкрэсліў, што перад Нацыянальным банкам стаяла задача, забяспечыўшы сваю ўстойлівасць, падтрымаць рэальны сектар эканомікі, у тым ліку і праз даступнасць крэдыту. «Не менш важная задача — яшчэ забяспечыць суправаджэнне знешнегандлёвых і ўнутраных здзелак. Што мы маем на гэты момант? Трэба адзначыць, што сёлета эканоміка працуе са станоўчым плацежным балансам, і прадпрыемствы, краіна атрымалі за 9 месяцаў 2,1 мільярда дадатковай выручкі, якая прадпрыемствамі была выкарыстана часткова для пагашэння знешняй крэдыторскай запазычанасці, часткова — для пагашэння крэдытаў беларускіх банкаў у замежнай валюце. Склалася нядрэнная рэнтабельнасць у рэальным сектары эканомікі, недзе на чыстай аснове 12,5 мільярда рублёў прыбытку. І гэта таксама дазволіла прадпрыемствам вырашаць свае праблемы самастойна. Такім чынам, мы маем вельмі пазітыўную сітуацыю, калі плацежаздольны попыт, асабліва ў беларускіх рублях, задавальняецца банкаўскай сістэмай, а крэдыты ў замежнай валюце скараціліся, што, уласна кажучы, вельмі пазітыўна. З пункту гледжання выкарыстання або доступу да крэдытаў пытанняў у плацежаздольных прадпрыемстваў няма», — расказаў Павел Калаур.

Што да інфляцыі, то старшыня праўлення Нацыянальнага банка расказаў: прымаюцца ўсе меры, каб інфляцыя зніжалася. «Прагнозы аптымістычныя, мы чакаем, што ўжо прайшлі пік высокай інфляцыі, і яна паступова будзе запавольвацца. Адпаведна, працягнецца працэс зніжэння ставак па крэдытах. Ды і ўсё гэта ў сукупнасці стварае нармальныя ўмовы для рэальнага сектара эканомікі па даступнасці крэдытаў», — адзначыў ён.

Кажучы пра стратэгію Нацыянальнага банка на найбліжэйшы час, Павел Калаур падкрэсліў, што Нацыянальны банк, іншыя банкі і ў цэлым банкаўская сістэма паводзяць сябе прафесійна і вельмі адказна.

Заканадаўчыя навацыі

КАНСАЛІДАЦЫЯ ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ

Праект закона «Аб Усебеларускім народным сходзе» вынесены на грамадскае абмеркаванне

Азнаёміцца з законапраектам, а таксама прыняць удзел у грамадскім абмеркаванні можна на сайце Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (forumpravo.by). Унесці свае прапановы і заўвагі, выказаць уласнае меркаванне ёсць магчымасць у кожнага. Гэта можна зрабіць да 2 лістапада 2022 года як у пісьмовым, так і ў электронным выглядзе.

Згодна з законапраектам, Усебеларускі народны сход з'яўляецца найвышэйшым прадстаўнічым органам народаўладдзя Рэспублікі Беларусь, які вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага строю, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду. Дакумент вызначае прававы статус, кампетэнцыю, парадак фарміравання Усебеларускага народнага сходу, правы і абавязкі дэлегата УНС, прынцыпы і арганізацыйныя асновы дзейнасці сходу.

Як адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве Святлана ЛЮБЕЦКАЯ,** з улікам стадыі грамадскага абмеркавання законапраект будзе дапрацаваны, каб з выкананнем усіх патрабаванняў закона ён быў унесены ў Палату прадстаўнікоў для разгляду ў першым чытанні. Па словах дэпутата, у Беларусі ёсць добры досвед грамадскага абмеркавання, — калі працавала канстытуцыйная камісія. «Гэта была кансалідаваная работа і спецыялістаў, і прадстаўнікоў грамадскасці, якія выказвалі сваё меркаванне, няхай нават без канкрэтных прапаноў, па тым ці іншым пытанні», — заўважыла парламентарый.

Усебеларускі народны сход будзе фарміравацца на парытэтнай аснове. У яго склад увойдуць прадстаўнікі органаў улады, судовай улады, дэпутацкага корпуса, грамадзянскай супольнасці — усяго да 1200 дэлегатаў. У законапраекце замацаваны паўнамоцтвы новага дзяржаўнага органа, а таксама функцыі прэзідыума. Пры гэтым рашэнні, якія павінны прымацца менавіта шырокім прадстаўніцтвам, заўважыла Святлана Любецкая, не пярэчаць да паўнамоцтваў абмежаванай колькасці прэзідыума — гэта спецыяльна замацавана ў праекце закона.

Прэзідыум Усебеларускага народнага сходу прызначаны для забеспячэння яго функцыянавання: для падрыхтоўкі чарговага сходу, кантролю за выкананнем рашэнняў. Узначаліць УНС старшыня, які будзе абірацца самім сходам на першым пасяджэнні. Прапануецца, што ў старшыні будуць намеснікі. Старшыня УНС, а таксама яго намеснікі будуць працаваць на прафесійнай аснове, дэлегаты — на грамадскіх пачатках.

Падчас падрыхтоўкі законапраекта з улікам гістарычнай і заканадаўчай базы вырашаліся тры асноўныя задачы. Першая — замацаваць такі механізм фармавання УНС, які, з аднаго боку, забяспечваў бы аўтарытэт, прафесіяналізм і эфектыўнасць працы дэлегатаў, з іншага — легітымнасць сходу. Гэта значыць, прызнанне грамадствам прыманых сходам рашэнняў за кошт прадстаўніцтва дэлегатаў — ад усіх галін улады, мясцовых саветаў дэпутатаў і грамадзянскай супольнасці. «Пры гэтым парадак абрання дэлегатаў ад мясцовых Саветаў дэпутатаў і грамадзянскай супольнасці павінен быць максімальна простым, выключаць складаныя шматступеньчатыя працэдуры, каб лішні раз не далучаць ЦВК і суды ў разглядзе скаргаў, — адзначыла старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па заканадаўстве. — Яшчэ на стадыі работы Канстытуцыйнай камісіі быў вызначаны падыход — не ператвараць фарміраванне УНС у яшчэ адну электаральную кампанію».

Другая задача, якая ставілася пры падрыхтоўцы праекта закона, — вызначыць парадак рэалізацыі канкрэтных канстытуцыйных паўнамоцтваў УНС, вызначыўшы менавіта ў законе ўстанаўленне лёсавызначальных для краіны рашэнняў: пачынаючы ад ініцыявання правядзення рэспубліканскіх рэферэндумаў да аб'яўлення і ўвядзення надзвычайнага або ваеннага становішча. Трэцяя задача — сфарміраваць кампактную структуру УНС, дакладна вызначыць паўнамоцтвы старшыні, функцыі прэзідыума, каб яны не перасякаліся з кампетэнцыяй сходу і не падмянялі яго.

Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, першае пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу адбудзецца на працягу 60 дзён пасля адзінага дня галасавання (25 лютага 2024 года). Да гэтага часу склад яго дэлегатаў будзе ўжо вызначаны. Пачнецца плённая праца на карысць народа і Айчыны.

Вераніка КАНЮТА.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю КУЛАКОВА Уладзіміра Панцялеевіча, былога старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта, старшыні абласнога Савета дэпутатаў, кіраўніка абласнога камітэта прыродных рэсурсаў, ганаровага грамадзяніна горада Віцебска, і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Moody's змяніла прагноз па рэйтынгах Вялікабрытаніі на «негатыўны»

Агенцтва Moody's пацвердзіла рэйтынг Вялікабрытаніі на ўзроўні «Аа3», змяніўшы яго прагноз са «стабільнага» на «негатыўны». Пагаршэнне абумоўленае «непрадказальнасцю палітычнага курсу краіны ва ўмовах пагаршэння перспектыў росту і высокай інфляцыі», адзначаецца ў прэс-рэлізе агенцтва. Эксперты таксама бачаць рызыкі, звязаныя з магчымасцю нарошчвання дзяржзапазычанняў Вялікабрытаніяй і верагоднасцю ўстойлівага аслаблення даверу да палітыкі, якая праводзіцца ў краіне. Агенцтва таксама змяніла прагноз па рэйтынгах Банка Англіі са «стабільнага» на «негатыўны», пацвердзіўшы рэйтынгі ЦБ на ўзроўні «Аа3». На думку экспертаў агенцтва, Цэнтрабанку «давядзецца істотна ўзмацніць жорсткасць грашова-крэдытнай палітыкі, улічваючы рызыку таго, што інфляцыя можа стаць больш устойлівай у сяроднетэрміновай перспектыве». Гэта будзе стрымліваць эканамічны рост Вялікабрытаніі, адзначаюць у Moody's.

Саудаўская Аравія аб'явіла аб запуску ініцыятывы, якая датычыцца глабальных ланцужкоў паставак

Наследны прынц Саудаўскай Аравіі Мухамед бен Сальман Аль Сауд заявіў аб запуску ініцыятывы, якая датычыцца работы ланцужкоў паставак у свеце, паведаміла ТАСС. Па словах Аль Сауда, праект накіраваны на дасягненне стабільнага функцыянавання глабальных ланцужкоў паставак. Ініцыятыва таксама будзе выгаднай інвестарам. Для рэалізацыі плана на працягу двух гадоў плануецца прыцягнуць інвестыцыі на суму 10 мільярдаў долараў. Інвестары, у тым ліку міжнародныя кампаніі, змогуць ажыццяўляць сваю дзейнасць у асаблівых эканамічных зонах, якія плануецца стварыць у Саудаўскай Аравіі. Аль Сауд адзначыў, што дзякуючы праекту краіна стане «жыццёва важным цэнтрам і сувязным звяном».

Кантэкст

СІЛА — У ПРАЎДЗЕ

Нашай краіне ніякая вайна не патрэбная. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў журналістам на агульнавайсковым палігоне Абуз-Лясноўскі. «Мы сёння нікуды не збіраемся ісці. Генерал Хрэнін правільна і дакладна сказаў: калі вы не хочаце з намі ваяваць, значыць, вайны не будзе, — падкрэсліў беларускі лідар. — Калі ж хтосьці прыйдзе з вайной на беларускую зямлю, то зразумела, што ўсе стануць на абарону краіны». «Трэба супакоіцца. Кожны павінен рабіць сваю справу, калі мы хочам, каб не было вайны», — заклікаў Аляксандр Лукашэнка. Даведацца аб усім можна без праблем — па даручэнні кіраўніка дзяржавы кіраўніцтва сілавога блока сустракаецца з працоўнымі калектывамі па ўсёй краіне для кампетэнтнага інфармавання па пытаннях існуючай ваенна-палітычнай абстаноўкі ў краіне і за мяжой.

Фота БелТА.

Прадстаўнікі вышэйшага органа дзяржаўнага кіравання гэтымі днямі правялі шэраг сустрэч з працоўнымі калектывамі. Так, на вытворчасці УП «Гефест-Тэхніка» адбылася сустрэча з працоўным калектывам прадпрыемства па пытаннях інфармавання ваенна-палітычнага становішча ў краіне і за мяжой. На здымку: дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.

БЕЗ ПАНІКІ

Сілавы блок Рэспублікі Беларусь можа гарантаваць бяспеку грамадзян — прычын для хвалявання няма, кожны павінен займацца справай на сваім месцы. Аб гэтым заявіў **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** на сустрэчы з калектывам унітарнага прадпрыемства «Гефест-тэхніка» ў Брэсце, паведаміла БелТА. «Абстаноўка складаная, сапраўды напружаная. Захад, абвінавачваючы Беларусь, імкнецца ўцягнуць яе ў ваенны канфлікт, спрабуе мілітарызавацца, праводзячы вялікую колькасць вучэнняў, папракаючы нас у нейкай агрэсіі. Хоць у Беларусі ніякіх планаў па павелічэнні вучэнняў няма, усё ідзе на планавай аснове. Ніякай панікі не павінна быць», — адзначыў дзяржсакратар Савета бяспекі.

Ва ўмовах гібрыднай вайны абстаноўка ў краіне кіруемая ў многім дзякуючы Прэзідэнту, які пастаянна трымае яе на асабістым кантролі. «Ваенна-палітычная абстаноўка, на жаль, мае тэндэнцыю да абвастрэння і падыходзіць да той чырвонай рысы, якая, напэўна, сапраўды з часоў халоднай вайны дасягнула мяжы. Прапрацоўваецца розны комплекс мер па стабілізацыі і недапушчэнні падрыву сітуацыі на тэрыторыі краіны. Беларусь заўсёды стаяла за вырашэнне праблем мірна, шляхам перагавораў, без вайны, без разбурэнняў. Вельмі дарагога вартае тое, што намі створана за 30 гадоў на тэрыторыі суверэннай Беларусі», — падкрэсліў Аляксандр Вальфовіч.

РАСКРЫЛІ РЭЗІДЭНТУРУ

Сітуацыя ў паўднёвым напрамку ўскладняецца не па віне Беларусі. Аб гэтым заявіў **старшыня Камітэта дзяржаўнай бяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ** перад сустрэчай з калектывам ААТ «Гродна Азот» і ідэалагічным актывам арганізацый Гродна, паведаміла БелТА. «На жаль, сітуацыя складваецца вельмі сур'ёзна на нашым паўднёвым напрамку. Практычна кожны дзень мы бачым узмацненне разведвальнай дзейнасці з украінскай тэрыторыі, штодня спробы парушэння паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь», — сказаў Іван Тэртэль. Ён дадаў, што фіксуецца ад 6 да 10 такіх фактаў, усе яны спыняюцца.

На тэрыторыі Беларусі спынена дзейнасць ваеннай разведкі Украіны ГУР-рэзідэнтуры, заявіў Іван Тэртэль. «Затрыманы рэзідэнт, грамадзянін Украіны, а таксама двое нашых грамадзян, якія сталі на шлях здрадніцтва, працавалі ў інтарэсах замежнай дзяржавы. Акрамя таго, намі затрыманы былы ваеннаслужачы, падпалкоўнік, ён працаваў на службу бяспекі Украіны. Сустрэчы праводзіліся ў тым ліку ў Адэсе, іншых гарадах, на тэрыторыі трэціх дзяржаў. Вялікая колькасць грамадзян Украіны, якія закідваліся на нашу тэрыторыю, намі затрыманы ў іншых рэгіёнах краіны», — сказаў Іван Тэртэль.

Старшыня КДБ Беларусі дадаў: «Грамадзянін Украіны, які быў маршрутызаваны праз Польшчу на нашу тэрыторыю ў адным з прыгранічных раёнаў, стварыў агентурную сетку, завербаваў нашых грамадзян, якія збіралі інфармацыю закрытага характару аб дзейнасці нашых Узброеных Сіл, сілавых структурах, і іншую інфармацыю, якая складае дзяржаўную тайну. Адпаведна, яны былі затрыманы і прыцягнуты да крымінальнай адказнасці».

«Пастаянна адчуваюць правакацыі нашы пагранічнікі на Дзяржаўнай граніцы. Фактычна кожны дзень гэта пагроза прымянення зброі ў адносінах да нашых ваеннаслужачых, гэта знявагі, іншыя акты, якія не адпавядаюць высокаму ўзроўню ваеннаслужачых у любых дзяржавах», — падкрэсліў Іван Тэртэль.

СУПРАЦЬ ЧОРНЫХ ПЛАНАЎ ЗАХАДУ

Людзі ў пагонах не дапусцяць развязвання ўзброенага канфлікту на тэрыторыі Беларусі, заявіў **міністр абароны Рэспублікі Беларусь Віктар ХРЭНІН** у час інфармавання на Мінскім трактарным заводзе. «Хачу запэўніць: мы дакладна ведаем сваю задачу, абстаноўку кантралюем, праводзім комплекс перш за ўсё прэвентыўных мерапрыемстваў для выканання той задачы, якую паставіў кіраўнік дзяржавы. Паверце, мы гэта робім прафесійна і са сваімі задачамі справімся», — запэўніў Віктар Хрэнін.

Інфармуючы людзей у калектывах, мы разбураем чорныя планы Захаду, заявіў міністр абароны ў ААТ «Беларуськалій». Паводле яго слоў, сёння інфармацыйны фон перапоўнены лжывай і недакладнай інфармацыяй. «З яе дапамогай спрабуюць спарадзіць трывожнасць, маніпуляваць грамадствам, каб потым выканаць свае чорныя планы. Самая галоўная наша задача — не дапусціць ваеннага канфлікту на тэрыторыі нашай краіны. Мы паказваем, што ведаем іх планы. Тым самым іх раззбройваем, прымушаем нервавацца, удакладняць свае планы і, вядома, паказваем сваю рашучасць, гатоўнасць абараняць сваю любімую Радзіму — Рэспубліку Беларусь», — падкрэсліў міністр абароны.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Інфармацыя павінна зыходзіць з першакрыніцы, тады яна будзе дакладнай, без усякіх скажэнняў. Такое меркаванне выказаў **намеснік старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі ААТ «МТЗ» Віталь КУХТА.** Ён узяў удзел у інфармаванні на Мінскім трактарным заводзе. «Людзі павінны валодаць інфармацыяй, каб разбірацца ў сітуацыі, якая складваецца ў краіне і за яе межамі. Такія сустрэчы заўсёды карысныя. Не проста ўбачыць першых асоб дзяржавы, але і задаць хвалюючыя пытанні», — заўважыў Віталь Кухта.

«Мы ўсе ведаем, у якой абстаноўцы цяпер знаходзімся, якія падзеі адбываюцца вакол нашай краіны. Сёння баявыя дзеянні ідуць не толькі на франтах, а больш за ўсё ў інфармацыйным полі, — адзначыў **начальнік упраўлення ўласнасці ААТ «МТЗ» Мікалай КУЗЬМІЦКІ.** — Таму праўда мае насамрэч такую ж сілу, як сіла жалеза».

Пётр ДУНЬКО.

ДАХОДЫ І РАСХОДЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

І ўжо сёння некаторыя людзі сутыкнуліся з пытаннямі, і каб разабрацца ў іх, спатрэбілася прафесійная дапамога, адзначае **адвакат юрыдычнай кансультацыі № 1 Мінскай абласной калегіі адвакатаў Алена ГРОНСКАЯ.** Спецыяліст расказала аб працэдуры праверкі адпаведнасці выдаткаў грамадзяніна яго даходам, а таксама аб наступствах перавышэння выдаткаў над даходамі.

— У Законе ад 31 снежня 2021 г. «Аб змяненні законаў па пытаннях падаткаабкладання» ёсць вельмі важны момант, які датычыцца ўсіх грамадзян як фізічных асоб: уведзены артыкул 73-1 «Камеральная праверка адпаведнасці выдаткаў даходам фізічнай асобы». Згодна з гэтым артыкулам, **падатковая інспекцыя мае права правяраць даходы і выдаткі кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, а таксама замежнікаў і асоб без грамадзянства з пасведчаннем на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь за ўсе поўныя месяцы бягучага года і за мінулыя 10 каляндарных гадоў.**

Іншымі словамі, тлумачыць адвакат, калі грамадзянін, які мае невысокую альбо сярэднюю заработную плату, набудзе дарагі аўтамабіль прэміум-сегмента альбо эксклюзіўную нерухомасць, дадзеная акалічнасць дакладна зацікавіць падатковую інспекцыю, і яна запатрабуе тлумачэнняў: адкуль грошы? Але гэта — той выпадак, калі матывы праверкі відавочныя. Калі ж казаць аб не настолькі відавочных сітуацыях — як падатковая інспекцыя вызначае адпаведнасць даходаў і выдаткаў грамадзяніна?

— Падатковыя органы правяраюць адпаведнасць расходаў і даходаў у форме камеральнай праверкі на падставе наяўных дакументаў і інфармацыі аб атрыманых грамадзянінам даходах і панесеных выдатках. Мэта праверкі — устанаўленне фізічных асоб, чые расходы перавышаюць даходы, а таксама сум фактычных выдаткаў і крыніц іх даходаў. Пры супастаўленні выдаткаў і даходаў улічваюцца толькі сумы даходаў, атрыманыя не пазней ад даты ажыццяўлення расходаў. Даходы, атрыманыя пасля даты ажыццяўлення расходаў, улічваюцца як даходы, якія засталіся ў распараджэнні фізічнай асобы.

Удакладнім, **каго менавіта правярае падатковая інспекцыя згодна з артыкулам 73-1. Што з'яўляецца падставай для праверкі адпаведнасці расходаў і даходаў?** І як адбываецца праверка?

— Падставай для правядзення праверкі можа стаць наяўная ў падатковым органе інфармацыя (дакументы) аб атрыманых даходах, панесеных выдатках; пісьмовы запыт КДК, МУС, органаў дзяржбяспекі, пракуратуры і Следчага камітэта (у сувязі з вядзеннем адміністрацыйнага працэсу, а таксама па крымінальных справах, паведамленнях аб злачынствах); даручэнне міністра па падатках і зборах, яго намеснікаў, кіраўнікоў ІМПЗ, іх намеснікаў. Пералік падстаў для правядзення праверкі досыць шырокі. Праверка праводзіцца без выдачы прадпісання на яе правядзенне. Такім чынам, падатковая інспекцыя не папярэджвае грамадзян аб пачатку праверкі. Праверка ўключае папярэдні і наступны этапы. Папярэдні этап праводзіцца на падставе інфармацыі і звестак, наяўных у падатковага органа. Па заканчэнні папярэдняга этапу праверкі падатковы орган складае разлік выдаткаў і даходаў фізічнай асобы. Наступны этап праверкі праводзіцца, калі падатковы орган выявіць перавагу выдаткаў грамадзяніна над яго даходамі. У дадзеным выпадку падатковая інспекцыя запатрабуе ў грамадзяніна справаздачу аб крыніцах даходаў шляхам накіравання патрабавання прадставіць тлумачэнні аб крыніцах даходаў, уручанага пад подпіс, альбо накіравання патрабавання па пошце заказным пісьмом з паведамленнем аб атрыманні.

На прадстаўленне тлумачэнняў адносна перавышэння расходаў грамадзяніну даецца 30 каляндарных дзён з дня ўручэння патрабавання, расказала адвакат.

— Указаны тэрмін падаўжаецца падчас хваробы грамадзяніна, знаходжання яго за мяжой або ў камандзіроўцы пры наяўнасці пісьмовага пацвярджэння. У выпадку парушэння названага тэрміну, а таксама ў выпадку прадстаўлення няпоўных звестак, падатковы орган не прымае такія даходы ў разлік.

Даць тлумачэнні грамадзянін мае права ў пісьмовай ці электроннай форме: накіраваць праз асабісты кабінет падаткаплацельшчыка, па пошце, або асабіста адвезці ў падатковую інспекцыю.

— У тлумачэннях аб крыніцах даходаў варта ўказаць звесткі аб фізічнай асобе (месца жыхарства), найменні юрыдычнай асобы (месца знаходжання), від, памер і дату (перыяд) атрымання даходу, звесткі (дакументы), звязаныя з правядзеннем праверкі, — то-бок пацвердзіць тлумачэнні. Крыніцамі даходаў могуць з'яўляцца, напрыклад, заработная плата, дывідэнды, спадчына, дарэнне, продаж транспартнага сродку, страхавыя выплаты, дапамога на дзяцей, аліменты і іншае. Калі названыя ў тлумачэннях звесткі не выклічуць сумненняў, падатковая інспекцыя ўлічыць даходы пры супастаўленні з выдаткамі. Пры праверцы падатковы орган улічыць у якасці выдаткаў суму на куплю тавараў і паслуг, неабходных для захавання здароўя і забеспячэння жыццядзейнасці, у памеры бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, а для непаўналетняга дзіцяці — у памеры 50 % бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Такім чынам, не мае прававога значэння, купляеце вы прадукты ў дарагой краме або таннай, альбо харчуецеся выключна прадуктамі «з агарода», — растлумачыла адвакат.

У выпадку, калі фізічнай асобай у тлумачэннях заяўлены даходы, атрыманыя ў перыяд, які перавышае дзесяць поўных каляндарных гадоў, што папярэднічаюць году, калі праводзіцца праверка, то праверка праводзіцца таксама за перыяд пачынаючы з каляндарнага года, у які фізічнай асобай атрыманы такія даходы.

Але вось праверка праведзена. Якімі могуць быць яе наступствы для грамадзяніна?

— Пасля разгляду прадстаўленых тлумачэнняў падатковы орган складае ўдакладнены разлік выдаткаў і даходаў, а затым накіроўвае грамадзяніну паведамленне аб адсутнасці перавышэння расходаў над даходамі (пры наяўнасці падстаў). Пры выяўленні перавышэння падатковы орган складае акт праверкі, пра які паведамляе грамадзяніну. Выяўленая сума перавышэння расходаў над даходамі абкладаецца падаходным падаткам па стаўцы 20 %, а гэта значыць, прыйдзецца заплаціць падатак. Такім чынам, у выпадку атрымання патрабавання аб прадстаўленні тлумачэнняў аб крыніцах даходаў варта сур'ёзна паставіцца да выканання абавязацельства даць тлумачэнні і не ігнараваць законныя патрабаванні падатковага органа, — падкрэсліла адвакат Алена Гронская.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 7 (70)

Беларусь сінявокая

ПАДЗЕМНАЯ, КРЫНІЧНАЯ, МІНЕРАЛЬНАЯ...

Эксперты расказалі пра якасць, унікальнасць і запасы айчыннай вады

Праблем з запасамі пітной і мінеральнай вады ў Беларусі няма, сцвярджаюць спецыялісты. Наша краіна, у якой больш за 20 тысяч рэк, 10 тысяч азёр і тысячу сажалак, уваходзіць у дваццатку дзяржаў па забяспечанасці доступу насельніцтва да чыстай вады і на пятым месцы сярод еўрапейскіх краін — па забяспечанасці вадой. Летась, напрыклад, беларусы здабылі і выкарысталі больш як 1,280 млрд м³ вады, 40 % якой пайшло на гаспадарча-пітныя патрэбы.

На аднаго беларуса прыходзіцца 6,1 тысячы м³ вады ў год, штодня нашы жыхары ўжываюць да 200 яе літраў, падлічылі эксперты. Яны ж сцвярджаюць, што піць ваду з-пад крана бяспечна ў любым горадзе краіны. Нават калі яна мае не вельмі прыемны пах хлору, гэта не сведчыць пра дрэнную якасць, бо перш чым трапіць да спажыўца, вада праходзіць спецыяльную падрыхтоўку, каб стаць бяспечнай для чалавека. Наяўнасць у падземных водах нітратаў — вынік сельскагаспадарчай дзейнасці, а павышанае ўтрыманне жалеза і марганцу абумоўлена прыроднымі фактарамі, кажуць яны.

Прэсная вада на «добра» і «выдатна»

Вада, дзе ўтрыманне солей не перавышае 0,5 %, лічыцца прэснай. Такіх радовішчаў у нашай краіне больш за 400. Іх рэсурс ацэньваецца як 43560,0 м³/сут. Стан паверхневых водных аб'ектаў (якасць вады, яе чысціня і бяспечнасць) вызначаецца ўзроўнем эканамічнага развіцця рэгіёна: рэсурсы паверхневых водаў выкарыстоўваюцца для патрэб прамысловасці, сельскай гападаркі, гідраэнергетыкі, воднага транспарту, рэкрэацыі і турызму.

Бяспека крыніц

У рамках Дзяржпраграмы «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» Мінпрыроды праводзіць інвентарызацыю паверхневых водных аб'ектаў. Згодна з данымі Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя, стан (статус) большасці паверхневых водных аб'ектаў, якія летась былі ахоплены назіраннямі, па гідрахімічных паказчыках вызначаўся як «выдатны» і «добры». Стан паверхневых водных аб'ектаў па гідрабіялагічных паказчыках (даследаванні праводзяцца раз на два гады) у басейнах рэк Нёман, Заходні Буг і Дняпро палепшыўся ў параўнанні з 2019-м, паведаміў **Анатоль СІЛЬЧАНКА, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў (ЦНДІКВВР):**

— Лічыцца, што вада з крыніцы — чысцюткая і карысная, аднак гэта не зусім так. У 2017—2020 гадах навукоўцы ўпершыню правялі даследаванне айчынных крыніц. Па яго выніках пацверджана наяўнасць 1183 крыніц, 95 % з якіх маюць дэбіт (магутнасць) 0,01-0,1 л/с. Гэта дазваляе забяспечыць сутачную патрэбу ў пітной вадзе (чатыры літры) чалавека пры ўмове прыдатнасці для піцця 75 % верыфікаваных крыніц. Тым не менш, крыніца — гэта натуральны выхад падземных водаў на паверхню, што падвяргае іх рызыцы забруджвання і вычарпання. Каб адназначна казаць, што крынічную ваду можна выкарыстоўваць як пітную, неабходна не толькі ацаніць якасны склад вады крыніцы і яе дэбіт, але і забяспечыць яе ахову ад навакольных забруджвальнікаў.

На жаль, комплекснага даследавання якасці крынічнай вады не праводзілася. Былі толькі выбарачныя даследаванні, якія не даюць поўнай карціны функцыянавання крыніц. Лабараторныя выпрабаванні крынічнай вады паказваюць перавышэнне ў ёй дапушчальных канцэнтрацый нітрат-іонаў, фасфат-іонаў і мікрабіялагічных паказчыкаў. Відавочна, што найбольш падвяргаюцца забруджванню крыніцы паблізу ад аўтадарог, сельскагаспадарчых зямель і ў межах населеных пунктаў.

— Падчас інвентарызацыі ацэнены стан больш як тысячы крыніц, вызначана іх дакладнае месцазнаходжанне з указаннем геаграфічных каардынат. Вывучаны марфаметрычныя і гідралагічныя характарыстыкі, тып сілкавання, ступень добраўпарадкаванасці, наяўнасць каптажу (спецыяльна абсталяваных канструкцый для збору вады), а таксама ўказана прыналежнасць да асабліва ахоўных прыродных тэрыторый. Верыфікацыя на мясцовасці праводзілася з выкарыстаннем беспілотнага лятальнага апарата з наступнай апрацоўкай даных у геаінфармацыйнай сістэме, — расказаў спецыяліст.

Найбольш магутныя крыніцы знаходзяцца ў Мінскай (8 %), Магілёўскай (5 %) і Гродзенскай (5 %) абласцях.

Антрапагеннае і кліматычнае ўздзеянні

На стан паверхневых водаў уплываюць як антрапагенныя фактары, так і змена клімату. Па выніках інвентарызацыі, у паўднёвай частцы Беларусі ў басейне ракі Прыпяць больш за 30 % малых рэк і ручаёў мае перасохлыя ўчасткі рэчышча. У паўночна-заходняй частцы краіны ў басейне ракі Нёман перасохлыя ўчасткі назіраюцца радзей, адзначыў спецыяліст ЦНДІКВВР:

— Паверхневыя водныя аб'екты, якія падвяргаюцца найбольшай антрапагеннай нагрузцы, — гэта рака Свіслач у Каралішчавічах; Лошыца ў Мінску; Пліса ў раёне Жодзіна; Уза і Дняпро ў Сарвірах (басейн Дняпра); Нарэў, Лясная Правая, Мухавец у межах Брэста (басейн ракі Заходні Буг); Іпа, Ясельда ніжэй Бярозы; Морач (басейн ракі Прыпяць); Уша ніжэй Маладзечна; Крынка ў Генюшах (басейн ракі Нёман).

На якасць вады ўздзейнічае мноства фактараў. Гэта скід гаспадарча-бытавых і вытворчых сцёкавых водаў; вынас забруджвальных рэчываў паверхневымі, грунтавымі і сцёкавымі водамі з урбанізаваных і сельскагаспадарчых тэрыторый; паступленне забруджвальных рэчываў ад разгрупаваных на вадазборнай пляцоўцы басейнаў рэк жывёлагадоўчых комплексаў, складоў захоўвання ядахімікатаў, мінеральных угнаенняў, нафтапрадуктаў і іншых небяспечных аб'ектаў; выпадзенне забруджаных атмасферных ападкаў; трансгранічны перанос забруджвальных рэчываў.

— У Беларусі дзейнічаюць пэўныя стратэгічныя дакументы па кіраванні воднымі рэсурсамі. Гэта Нацыянальная стратэгія ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця на перыяд да 2030 года, Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гг., Стратэгія ў галіне аховы навакольнага асяроддзя да 2025 года, — заўважыў Анатоль Сільчанка. *— Адпаведна з пералічанымі дакументамі, наш інстытут займаецца навукова-даследчымі работамі для канкрэтных суб'ектаў гаспадарання. А таксама ўдзельнічае ў праграмах і мерапрыемствах у межах нацыянальных праграм і праграм Саюзнай дзяржавы з мэтай навуковых даследаванняў для фарміравання навукова абгрунтаваных мерапрыемстваў, скіраваных на рацыянальнае выкарыстанне водных рэсурсаў і іх аховы.*

Лекавыя ўласцівасці мінералкі

Натуральнай мінеральнай вадой лічыцца напой, здабыты з афіцыйна зарэгістраваных крыніц, а такіх радовішчаў у Беларусі 246 (самыя буйныя — у Нарачы, Рагачове, Бабруйску, Ждановічах, Ушачах, Горвалі, Летцах, Наваельні, Белым Беразе і возеры Белае) і мае вялікі запас прыродных мінералаў і мікраэлементаў. Газіраваная ж вада — насычаны вуглякіслым газам напой, аднак яна не з'яўляецца мінеральнай, хоць у ёй і могуць утрымлівацца мінералы і мікраэлементы. Аднак яны дадаюцца туды штучна, таму не засвойваюцца арганізмам, сведчаць эксперты Інстытута геалогіі.

Эксперты раяць штодня нашча выпіваць шклянку вады тэмпературай каля 40 градусаў, каб запусціць у арганізме працэсы абмену рэчываў і амаладжэння.

Для піцця і басейнаў

Спецыялісты кажуць, што ў мінеральную ператварылася дажджавая вада, якая прасочвалася пад зямлю скрозь слаі горных парод. Пры гэтым яна растварала соль, кальцый, магній, калій, хлор і серу, якія забірала з сабой. Так і з'явілася прыродная мінералка. Унікальнасць айчыннай мінеральнай вады ў шырокім дыяпазоне лячэбных параметраў: мінералізацыя ад 1 і менш да 35 г/дм³. Вада з высокім утрыманнем мінеральных рэчываў актыўна прымяняецца ў бальнеатэрапіі. Карысная яна для тых, хто мае захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы, апорна-рухальнага апарату, неўралагічныя і страўнікавыя праблемы.

— Аднясенне мінеральных водаў да лячэбных адбываецца на падставе бальнеалагічнага заключэння аб іх складзе і лячэбным прызначэнні, якое выдаецца ўпаўнаважаным органам Міністэрства аховы здароўя, — падзяліўся Анатоль Сільчанка. *— А выбар і асваенне радовішчаў падземных мінеральных водаў адбываецца згодна з ТКП 17.04-20-2010 Ахова навакольнага асяроддзя і прыродакарыстанне. Нетры. Правілы распрацоўкі і аховы радовішчаў падземных мінеральных лячэбных водаў. Па агульных характарыстыках мінералізацыі вада падзяляецца на ваду малой, сярэдняй і высокай мінералізацыі, расольныя воды і моцныя расолы.*

Для лячэння ваду п'юць (напой павінен быць 38-40 градусаў і ўжываюцца невялікімі порцыямі — па 100—200 мл тройчы на дзень) або прымаюць мінеральныя ванны ў санаторыях. Злоўжываць мінералкай нявартa, бо праз вялікую насычанасць соллю напой можа даць адваротны эфект, так што лячыцца такой вадой неабходна пад назіраннем урача, кажуць медыкі. Здаровым людзям лепш ужываць звычайную сталовую мінеральную ваду, якая прадаецца ў крамах.

Абмежаванне на здабычу і забарона на страту

Здабываюць мінеральную ваду са свідравін глыбінёй ад 150 да 1500 метраў. Штодня дастаткова атрымліваць 200—500 м³. Па сваім складзе прыродная мінералка падзяляецца на шэсць гідрагеахімічных класаў: гідракарбанатна-хларыдныя, гідракарбанатна-сульфатныя, сульфатныя, сульфатна-хларыдныя, хларыдныя, хларыдна-сульфатныя. Геалагічная разнастайнасць айчыннай мінералкі таксама дадае ёй унікальнасці. У Беларусі сустракаюцца рэдкія разнавіднасці: ёдныя, бромныя, борныя, жалезістыя, крамяністыя воды і воды з высокім утрыманнем арганічных рэчываў, падкрэсліваюць эксперты.

Самая багатая па запасах гэтага напою ў краіне вобласць — Віцебская, а здабываюць мінералкі больш за ўсё на Гомельшчыне. Пры гэтым своеасаблівай мінеральнай сталіцай лічыцца Мінск, а мінеральны запас краіны ацэньваецца ў 62134,27 м³/сут.

— Водападрыхтоўка здабытых мінеральных лячэбных водаў перад ужываннем, як правіла, патрабуецца толькі для зніжэння мутнасці вады або змяншэння яе засмечанасці суспензіраванымі рэчывамі з прычыны дэфектаў водазаборных свідравін, — растлумачыў спецыяліст.

Усе радовішчы мінералкі, што распрацоўваюцца, неабходна засцерагаць ад магчымага забруджвання і вычарпання. Для гэтага ўстанаўліваецца акруга і зоны санітарнай аховы, у межах якіх забаронены ўсякія работы, якія забруджваюць глебу, ваду і паветра ды наносяць урон лясам.

Мінеральная вада здабываецца ў парадку спецыяльнага водакарыстання, а перавышэнне вызначаных нормаў яе здабычы не дапускаецца.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Блакітны скарб краіны

Жыццё на нашай планеце зарадзілася ў воднай прасторы. І сёння вада працягвае заставацца адной з самых галоўных каштоўнасцяў чалавецтва. Пра асаблівасці складу і аб'ёму водных рэсурсаў Беларусі «Звязда» пагаварыла з намеснікам дырэктара па навуцы філіяла «Інстытут геалогіі» дзяржаўнага прадпрыемства «НВЦ па геалогіі» Вольгай ВАСНЁВАЙ.

ДАРАЖЭЙ ЗА ЗОЛАТА

— Вольга Уладзіміраўна, раскажыце, з чаго складаюцца водныя рэсурсы краіны? І чым багатая і ўнікальная ў гэтым плане Беларусь?

— Да водных рэсурсаў любой краіны адносяцца запасы прэснай вады, якая канцэнтруецца ў паверхневых і падземных водах.

Да паверхневых водаў адносяцца рэкі, азёры, ручаі, вадасховішчы і іншыя адкрытыя вадаёмы. Па тэрыторыі нашай краіны праходзіць водападзел басейнаў Балтыйскага і Чорнага мораў. Па ім працякае сем буйных рэк працягласцю больш за 500 км, шэсць з якіх (акрамя Бярэзіны) — трансгранічныя. У Беларусі налічваецца 41 сярэдняя рака (іх працягласць — 101-500 км) агульнай даўжынёй 6,7 тысячы кіламетраў. На першым месцы па колькасці — малыя рэкі працягласцю ад 5 да 10 км і ручаі, іх у краіне налічваецца каля 19,3 тысячы, а агульная даўжыня складае 48,8 тысячы кіламетраў. Усяго ж у Беларусі 20,8 тысячы рэк і ручаёў сумарнай даўжынёй звыш 90,6 тысячы кіламетраў.

Паводле даных Сусветнага банка, толькі 1/5 частка насельніцтва планеты мае доступ да бяспечнай пітной вады. Пры гэтым у ААН лічаць, што да 2025 года каля 2/3 насельніцтва свету сутыкнецца з вострай праблемай дэфіцыту вады.

На тэрыторыі краіны таксама знаходзіцца каля 10,8 тысячы азёраў, 88 % з якіх маюць плошчу люстэрка да 10 га. Азёраў з плошчай больш за 100 га ўсяго 2,2 %. У гэтых водных аб'ектах засяроджана каля 9 км³ вады.

Унікальны від водных аб'ектаў, характэрны для Беларусі, — крыніцы. Вада з іх самастойна выходзіць на паверхню зямлі. Крыніцы дапамагаюць падтрымліваць стабільнасць гідралагічнага рэжыму паверхневых водных аб'ектаў, а таксама прылеглых наземных біяцэнозаў.

Каб выкарыстоўваць паверхневыя водныя рэсурсы, чалавек спачатку павінен іх ачысціць, бо такая вада ўтрымлівае мінеральныя рэчывы, часцінкі раслін і грунту, адходы фабрык і заводаў.

Найбольш бяспечнымі і чыстымі з'яўляюцца **артэзіянскія воды** — напорныя пластавыя падземныя воды, якія залягаюць паміж пластамі воданепранікальных парод (гліны, жвіру, вапны) на глыбіні ад дзясяткаў да соцень і больш метраў. Калі прасячы верхні пласт, вада сама пад ціскам падымецца на паверхню. Артэзіянская вада празрыстая, бясколерная, не мае паху і якога-небудзь прысмаку.

Грунтавыя воды — безнапорныя падземныя воды, больш паверхневыя, якія назапашваюцца пад зямлёй над воданепранікальным слоем на невялікай глыбіні (ад аднаго да некалькіх дзясяткаў метраў). Менавіта такія воды назапашваюцца ў калодзежах. Грунтавая вада чыстая, празрыстая, але таксама можа ўтрымліваць нітраты, цяжкія металы, розныя мікраарганізмы, пестыцыды.

— Наколькі вялікія ў краіне запасы падземных водаў — пітной і мінеральнай?

— Увогуле падземныя воды на тэрыторыі краіны распаўсюджаны паўсюдна. Яны залягаюць на розных глыбінях і аднесеныя да пародаў з розным літалагічным складам. Наша краіна валодае значнымі натуральнымі і прагнознымі эксплуатацыйнымі рэсурсамі падземных водаў. Іх найбольш маштабная ацэнка праводзілася ў пачатку 1980-х.

Натуральныя (аднаўляльныя) рэсурсы прэсных падземных водаў у цэлым па краіне вызначаны ў 43,56 млн м³/сут. Гэта сумарны расход патоку падземных водаў, забяспечаны інфільтрацыяй атмасферных ападкаў. Прагнозныя эксплуатацыйныя рэсурсы ацэньваюцца ў 49,6 млн м³/сут. і вызначаюцца расходам вады, які можа быць атрыманы водазаборнымі збудаваннямі, размешчанымі па ўсёй плошчы краіны, за кошт натуральных рэсурсаў і водаў, што дадаткова прыцягваюцца з вадацёкаў і вадаёмаў (прыродных і штучных).

Яшчэ адно багацце, якім валодае Беларусь, — значныя рэсурсы мінеральных водаў. Ад звычайных пітных яны адрозніваюцца павышанай колькасцю соляў і мінералаў. Такія воды выкарыстоўваюцца для санаторна-курортнага лячэння, вытворчасці ў пітных мэтах. Балансавыя запасы мінеральных водаў па стане на пачатак 2021 года ацэньваюцца на 245 участках радовішчаў у колькасці 61,6 тысячы м³/сут. Самыя вялікія іх запасы знаходзяцца ў Віцебскай вобласці — 22,07 тыс. м³/сут., менш за ўсё — у Гродзенскай (1,43 тыс. м³/сут.). Больш за ўсё мінеральных водаў здабываецца на Гомельшчыне (455,4 тыс. м³/год), менш за ўсё — на Віцебшчыне (11,13 тыс. м³/год).

— На які тэрмін нам хопіць запасаў вады?

— Падземныя воды — аднаўляльны рэсурс. Яны папаўняюцца натуральным шляхам за кошт дажджоў і раставання снегу і ў меншай ступені за кошт паверхневых водаў (рэк і азёр). Спецыялісты падлічваюць запасы з перспектывай на 27 гадоў з улікам заяўленай патрэбнасці водакарыстальніка. Таму пры разумнай эксплуатацыі радовішчаў падземных водаў, іх рацыянальным выкарыстанні, а таксама спрыяльных прыродных і кліматычных умовах запасаў хопіць на многія пакаленні. Цяпер увогуле па краіне здабываецца каля 20 % ад зацверджаных запасаў.

— Калі ж пачалося даследаванне нетраў Беларусі на прадмет запасаў вады?

— Падземныя воды на нашай зямлі выкарыстоўваюць даволі даўно. Сляды калодзежаў сустракаліся падчас археалагічных раскопак пасяленняў IX–X стагоддзяў.

А вось звесткі пра гідрагеалагічныя ўмовы на тэрыторыі Беларусі знаходзяцца ў матэрыялах першых маршрутных геалагічных даследаванняў, якія праводзіліся ў канцы XVIII—пачатку XIX стагоддзя. Больш поўныя і сістэматызаваныя даныя пра падземныя воды ўтрымліваюцца ў матэрыялах геалагічных здымак тэрыторыі — яны праходзілі ў канцы XIX—пачатку XX стагоддзя, у справаздачах аб асушэнні балот, водазабеспячэнні гарадоў, чыгуначных станцый і іншых аб'ектаў. Шмат звестак было атрымана падчас работы даследчыкаў у пачатку XX стагоддзя.

— Якія радовішчы падземных водаў былі адкрытыя нядаўна?

— За апошні час новыя радовішчы падземных водаў у краіне не разведваліся. Цяпер праводзіцца ў асноўным пераацэнка запасаў на ўжо існуючых радовішчах. Акрамя таго, такая працэдура прызначаецца і пры эксплуатацыі адзіночных свідравін.

— Ці ёсць у Беларусі рэгіёны, якія зазнаюць недахоп вады?

— Калі казаць пра грунтавыя воды, то даныя маніторынгу падземных водаў у натуральных умовах, што праводзіцца ў межах Нацыянальнай сістэмы маніторынгу навакольнага асяроддзя, сведчаць: у большасці свідравін на поўдні краіны назіраецца зніжэнне ўзроўняў грунтавых водаў. За апошнія 29 гадоў яны знізіліся ад 0,2 да 0,78 м.

Такія змены могуць быць выкліканы як натуральнымі (метэаралагічнымі), так і тэхнагеннымі фактарамі. За апошнія два дзесяцігоддзі сярэднегадавая тэмпература ў Беларусі перавысіла норму на 1,1 °С. Пры гэтым колькасць ападкаў змянілася нязначна, але павялічылася нераўнамернасць іх выпадзення як на працягу года, так і ў асобныя гады. Усё гэта прыводзіць да з'яўлення засушлівых з'яў, паўтаральнасць якіх за гэтыя дзесяцігоддзі пачасцілася.

Нельга не ўлічваць і тэхнагенныя фактары. Тэрыторыі краіны з найбольшым паніжэннем узроўняў грунтавых водаў выдзелены ў раёнах, дзе праводзілася буйнамаштабная меліярацыя і актыўная сельскагаспадарчая дзейнасць. Пад уздзеяннем гэтых працэсаў адбылося асушэнне грунтавога гарызонту, змяніўся яго рэжым і баланс. Асабліва церпіць ад гэтага поўдзень краіны.

МОРА ГЕРАДОТА

У адрозненне ад сучаснасці, у старажытныя часы менавіта тэрыторыі сучасных Брэсцкай і Гомельскай абласцей былі часткай вельмі ўвільготненай мясцовасці, якую называюць морам Геродота. Сфарміравалася яно ў выніку раставання леднікоў. Даследчыкі знаходзяць шматлікія сведчанні яго існавання на картах з розных краін. А першы ўспамін пра гэты водны аб'ект зрабіў старажытнагрэчаскі гісторык Геродот 2500 гадоў таму. Ён пісаў, што на тэрыторыі сучаснага Палесся размешчана вялікае возера ці мора.

— Ці знаходзілі геолагі ў нашай краіне такія ж незвычайныя аб'екты?

У нетрах Беларусі маюцца рэсурсы тэрмальных водаў. У Прыпяцкім прагібе тэмпература падземных водаў на глыбіні 2000 м змяняецца ад 30,8 да 61,3 градуса, а на глыбіні 3000 м — ад 44 да 86,3 градуса.

— Леднікі, якія прыходзілі на нашы землі, пакінулі пасля сябе не толькі мора Геродота. У выніку іх «дзейнасці» ўтварыліся радовішчы будаўнічых матэрыялаў (пяскі, гліны, пясчана-жвіровыя сумесі), сфарміраваліся азёрныя катлавіны і маляўнічы перасечаны рэльеф сярэдніх і паўночных раёнаў краіны. Помнікам ледніковага перыяду з'яўляюцца і валуны.

Былі на гэтай тэрыторыі і сапраўдныя моры. Апошняе сышло 30 мільёнаў гадоў таму (у канцы палеагену). У марскіх умовах назапасілася пераважная большасць асадкавых адкладаў Беларусі. Калі паглядзім на геалагічную карту, убачым вялікую ізаметрычную пляму карычневага колеру на поўначы, зялёную палоску ў сярэдняй частцы і жоўтую — на поўдні. Такое раздзяленне паказвае, што паўночная частка сучаснай Беларусі стала сушай у канцы дзвонскага перыяду, сярэдняя — у канцы мелавога, а ў паўднёвай частцы марскія ўмовы захоўваліся даўжэй за ўсё.

Менавіта на поўдні знаходзіцца адзін з найбуйнейшых у свеце Прыпяцкі салявы басейн. Там калісьці назапасілася магутная тоўшча (да 3 км) каменнай і калійнай солей, якія засталіся «ў спадчыну» ад мора.

— Як сёння выкарыстоўваюцца водныя рэсурсы краіны?

— Працяглы перыяд часу гаспадарча-пітныя патрэбы застаюцца асноўным складнікам у выкарыстанні вады ў краіне. Паводле даных Белстата на 2021 год, гэты паказчык склаў 36,8 % ад агульнага выкарыстання вады. Значныя яе аб'ёмы ідуць таксама на патрэбы лясной, сельскай гаспадаркі, уключаючы рыбаводства (30,9 %), апрацоўчай прамысловасці (14,7 %), энергетычныя патрэбы (13,8 %) і іншыя.

— Наколькі чыстыя ў Беларусі падземныя воды?

— Даныя хімічных аналізаў падземных водаў як у натуральных (на гідралагічных пастах), так і ў парушаных эксплуатацыяй (з эксплуатацыйных і назіральных свідравін на групавых водазаборах) умовах сведчаць пра тое, што якасць падземных водаў у асноўным адпавядае ўстаноўленым патрабаванням. Выключэнне складаюць павышаныя паказчыкі перманганатнай акісляльнасці, агульнай жорсткасці, а таксама адхіленне ад нарматываў па паказчыках арганалептычных уласцівасцяў (колернасці, мутнасці). Гэтыя неадпаведнасці звязаныя з асаблівасцямі прыродных гідрагеалагічных умоў тэрыторыі Беларусі.

У той жа час на асобных свідравінах спецыялісты выяўляюць перавышэнні гранічна дапушчальных канцэнтрацый па азотазмяшчальных злучэннях, якія могуць быць абумоўленыя ўплывам антрапагенных фактараў (блізкае размяшчэнне да сельскагаспадарчых угоддзяў, прамысловых зон, забудаваных тэрыторый і г. д.).

Таму вельмі важна берагчы ад забруджвання такі каштоўны рэсурс. Ад вады залежаць наша бяспека, здароўе і ўвогуле далейшае існаванне.

Настасся АЛЯКСЕЕВА.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 10 %):

№ лота	Характеристика имущества	Местонахождение имущества	Начальная цена
1	**Изолированное помещение (назначение/ наименование: помещение финансового назначения) с инвентарным номером 200/D-127918, общей площадью 103,7 кв. м**	г. Витебск, ул. Суворова, 15, пом. 21	172 704,00 (сто семьдесят две тысячи семьсот четыре рубля 00 копеек), в т. ч. НДС по ставке 20 % – 28 784,00 (двадцать восемь тысяч семьсот восемьдесят четыре рубля 00 копеек)

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00 24.11.2022.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота в срок до 12.00 24.11.2022 на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000, открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

Аукцион состоится 28.11.2022 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ. Победитель аукциона либо единственный участник дополнительно возмещает расходы по оценке имущества в размере 300,00 руб. с НДС.

Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 4 286,42 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %): кассовое ограждение на пять рабочих мест (инв. номер 200990000004689), роллета защитная 1780х3200 (инв. номер 200990000004741), роллета защитная 1730х1700 (инв. номер 200990000004742), кондиционер MCQUAY MWM020QR/MLC020B (инв. номер 200990020102271), кондиционер настенный в составе: Mitsubishi SRC80Z (инв. номер: 304996).

Также победителю аукциона либо единственному участнику необходимо заключить договор аренды с ОАО «АСБ Беларусбанк» сроком на 1 год на часть нежилого помещения Объекта площадью 1 кв. м для размещения банкомата по арендной ставке не более 32,00 белорусских рублей с учетом НДС.

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.

Сведения о торгах

Дата и место проведения торгов – аукцион, 29.11.2022 в 12.00, г. Минск, ул. Берута, д. 3Б, оф. 213;

Сведения о предмете торгов, начальная цена – Лот № 1:

ИЗОЛИРОВАННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ (наименование – торговое помещение)

с инвентарным номером 500/D-798184109, расположенное по адресу:
г. Минск, ул. К. Туровского, 18-149.

Примечание: установлен запрет на совершение регистрационных действий.

Начальная цена: 52 800,00 белорусских рублей.

Сведения о продавце – ООО «Пицари Ленд», УНП 192679441;

Сведения об организаторе – ликвидатор ООО «Пицари Ленд» – ИП Рудяк Александр Олегович (220092, г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 213, тел. 8029-119-86-66);

Размер задатка: 5 % от стоимости предмета торгов должен быть зачислен на р/с ООО «Пицари Ленд» (УНП 192679441): BY21 REDJ 30121003 7062 0010 0933 в ЗАО «РРБ-Банк», код банка REDJBY22, до 25.11.2022.

Заявки на участие принимаются по адресу: 220092, г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 213 со дня публикации объявления до 15.00 25.11.2022.

Требования к участникам, порядок проведения торгов и возмещение затрат по их организации – в соотв. с Постановлением Совета Министров РБ от 08.01.2013 № 16, в т. ч.: **Шаг аукциона** – 5 % от начальной стоимости.

Победитель торгов – покупатель, предложивший наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися, продажа предмета аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Срок подписания договора и оплаты приобретенного предмета торгов, возмещения затрат – в течение 15 дней со дня проведения торгов.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **Речицкое районное потребительское общество** (УНП 400037088) 247500, г. Речица, ул. Привокзальная, д. 2 в лице ликвидатора Беланова Руслана Николаевича, тел. +375 (29) 690-00-10.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **09 ноября 2022 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

Предмет торгов –

Автомобиль ГАЗ 3302, АФХ 3302 «Любава», 2009 г. в.,

рег. знак № АЕ 4202–3, инв. № Х1136, грузовой фургон.

Начальная цена предмета торгов – 550,00 бел. руб. без НДС.

Местонахождение – Гомельская обл., г. Речица, ул. Привокзальная, 2. Телефон для ознакомления и осмотра: +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 26.10.2022 г. 09.00 по 08.11.2022 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «Сбер Банк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее десяти рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» 11.08.2022 г.

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества Бобруйское ОАО «Агромашсервис» (УНП 700003471), объявляет о проведении **09.11.2022 г.** в 09.00 электронных торгов на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Предмет торгов

№ п/п	Наименование	Начальная стоимость, бел. руб., без НДС	Сумма шага, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.	Минимальная стоимость, бел. руб., без НДС
1	**Лот № 1 «Здание неустановленного назначения, общей площадью 5 234,30 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000003000031» Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 78**	199000,00	9950,00	19900,00	79600,00

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375333014914.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 360,00 бел. руб; публикация в СМИ – 250,51 бел. руб., стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре, за оценку – 350,00 бел. руб, аукционный сбор 5 % от цены реализации имущества.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 30 календарных дней с даты проведения торгов.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

на строительство объекта «Многоквартирный жилой дом со встроенными помещениями общественного назначения по ул. Жуковского и наземным паркингом со встроенными помещениями общественного назначения»

ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ

Застройщик: ОАО «Минский домостроительный комбинат» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей решением Мингорисполкома 14 февраля 2001 г. за № 100258980.

Юридический (почтовый) адрес: 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43, телефоны для справок: (017) 3954860, +375 (44) 7771158;

Прием заявлений и заключения договоров: понедельник–четверг с 8.15–16.15, обед с 12.00–12.30, пятница с 8.15–15.00, обед с 12.00–12.30.

В течение трех предшествующих лет ОАО «Минский домостроительный комбинат» в качестве Застройщика (заказчика) построены следующие объекты:

«Реконструкция застройки территории в районе улиц Михалова, Алибегова. Жилой дом № 13», апрель 2017 – апрель 2018,

«Многоквартирный жилой дом на ул. Серова на месте снесенного дома № 54» апрель 2019 г. – декабрь 2019 г.,

«Многоквартирный жилой дом с подземной гаражстоянкой со сносом здания по просп. Партизанскому, 71Б» февраль 2019 – сентябрь 2020.

ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОБЪЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА

Проект разработан УП «Проектное управление» ОАО «Минскпромстрой».

По проектной документации получено положительное заключение государственной экспертизы РУП «Главстройэкспертиза» № 486-15/19 от 14.10.2019. Заключение государственной экспертизы РУП «Главстройэкспертиза» № 625-15/21 от 24.12.2021. Заключение государственной экспертизы РУП «Главстройэкспертиза» № 386-15/22 от 15.07.2022.

Земельный участок предоставлен для строительства объекта решением Мингорисполкома «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства» от 13.02.2020 г. № 408. Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации земельного участка от 10 марта 2020 года № 500/1805-1721.

Извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства Инспекции Госстройнадзора по г. Минску от 17 октября 2019 г. № 03/447. Объект зарегистрирован 17 октября 2019 года под № 2-204Ч-070/19.

Заказчиком и генеральным подрядчиком по строительству объекта выступает ОАО «Минский домостроительный комбинат».

Сведения об этапах строительства и сроках его реализации

Начало строительства – октябрь 2019 г.

Предполагаемый Заказчиком срок ввода объекта в эксплуатацию – май 2023 года.

Проектируемый объект расположен в Октябрьском административном районе г. Минска, в 100 метрах от станции метро «Ковальская Слобода». Участок объекта ограничен с севера-востока и юга улицами Быховская, Жуковского и Сенницкая – соответственно.

Жилой дом запроектирован 5-секционным, на 376 квартир со встроенными помещениями общественного назначения и помещением товарищества собственников. На первом этаже 2,3,4-секции расположены административные помещения.

Секции 1 и 5 – угловые- 14-этажные, секции 2 и 4 – 12-этажные, секция 3 – 11 этажная;

Во всех секциях имеется техподполье, кровля – плоская. Высота типового этажа – 3 м.

В каждой секции проектом предусмотрены:

- 2 входа в жилую часть через тамбуры;

- лестнично-лифтовой блок, состоящий из лестничной клетки, ведущей непосредственно наружу, и двух лифтов грузоподъемностью 400 кг и 630 кг, выходящих в лифтовой холл.

В жилом доме запроектированы 1, 2, 3, 4-комнатные квартиры. Общая площадь однокомнатных квартир от 30,01 м² до 43,47 м², двухкомнатных квартир от 51,30 м² до 55,61 м², трехкомнатных квартир от 63,98 м² до 115,97 м², четырехкомнатных от 95,54 м² до 97,16 м².

Квартиры имеют летние помещения (остекленные лоджии и балконы). Внутренняя отделка квартир предусмотрена без верхнего покрытия полов, с затиркой потолков, с выравнивающей штукатуркой стен. Окна-профиль ПВХ, двухкамерные стеклопакеты.

Наружные стены здания – из монолитного железобетона и керамического блока, горизонтального пустотелого толщиной 250 мм с утеплением снаружи по типу легкой штукатурной системы.

Перед домовой территорией предусмотрена зона тихого отдыха с детской игровой площадкой.

На земельном участке запроектирован наземный 5-уровневый паркинг на 300 машино-мест со встроенными торгово-административными помещениями на 1-м этаже.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельностью.

Строительство Объекта будет осуществляться в соответствии с заключенными договорами создания объектов долевого строительства (далее – договоры), предметом которых будет строительство жилого помещения и машино-места в наземном паркинге, а также жилое помещение в составе объекта строительства.

По настоящей проектной декларации:

• для многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по направлениям соответствующих администраций; при невостребованности многодетными семьями – иных категорий граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в этих администрациях предлагаются оставшиеся квартиры нераспределенные в администрациях районов г. Минска;

для граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц (в первую очередь предпочтение будет отдаваться гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, организациях г. Минска, без направлений администраций районов г. Минска) для заключения договоров создания объектов долевого строительства с учетом приобретения машино-места в наземном 5-этажном паркинге предлагаются 14 жилых помещений, в том числе:

7 однокомнатных квартир № **110** (34,7 м²) и машино-место № 280;

№ **126** (30,14 м²) и машино-место № 287; № **185** (32,63 м²) и машино-место № 281; № **192** (32,63 м²) и машино-место № 289; № **320** (35,86 м²) и машино-место № 285; № **324** (37,09 м²) и машино-место № 292; № **370** (36,35 м²) и машино-место № 286;

7 двухкомнатных квартир № **102** (51,45 м²) и машино-место № 279;

№ **127** (54,41 м²) и машино-место № 288; № **226** (54,82 м²) и машино-место № 282; № **235** (51,3 м²) и машино-место № 283; № **249** (51,45 м²) и машино-место № 284; № **267** (54,41 м²) и машино-место № 290; № **277** (52,97 м²) и машино-место № 291.

• для граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства на коммерческой основе с учетом приобретения машино-места в наземном 5-этажном паркинге предлагаются 18 жилых помещений, в том числе:

4 однокомнатные квартиры № 44 (37,76 м²) и машино-место № 247;

№ 203 (30,17 м²) и машино-место № 3; № 283 (33,39 м²) и машино-место № 218; № 330 (35,86 м²) и машино-место № 216;

14 двухкомнатных квартир № 116 (51,45 м²) и машино-место № 152;

№ 179 (51,52 м²) и машино-место № 156; № 183 (54,3 м²) и машино-место № 297;

№ 184 (54,08 м²) и машино-место № 162; № 207 (53,04 м²) и машино-место № 168;

№ 261 (54,01 м²) и машино-место № 180; № 134 (54,41 м²) и машино-место № 298;

№ 135 (54,76 м²) и машино-место № 66; № 159 (54,71 м²) и машино-место № 299;

№ 274 (54,41 м²) и машино-место № 33; № 278 (54,31 м²) и машино-место № 300;

№ 285 (54,31 м²) и машино-место № 88; № 289 (54,76 м²) и машино-место № 92;

№ 298 (52,96 м²) и машино-место № 95.

Объект долевого строительства сдается в эксплуатацию без выполнения чистовых отделочных работ.

Стоимость строительства 1 м² нормативной площади квартиры (с ограниченной прибылью) 1 983,32 белорусских рублей.

Стоимость строительства 1 м² общей площади квартиры, превышающей нормативную и для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в том числе индивидуальных предпринимателей и (или) юридических лиц составляет 3 200,00 белорусских рублей.

Ограниченная прибыль устанавливается в пределах нормативной площади, которая составляет 15 м² в г. Минске на дольщика, а также на каждое лицо, состоящее на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий и осуществляющее строительство объекта долевого строительства совместно с дольщиком (при строительстве для одного человека однокомнатной квартиры – 30 кв. метров).

Стоимость машино-места составляет 27 000 белорусских рублей.

Стоимость квадратного метра квартир сформирована без учета затрат застройщика, не включенных в сводный сметный расчет стоимости строительства объекта долевого строительства, но относимых на стоимость строительства. Данные затраты будут предъявлены дольщику по окончанию строительства с заключением дополнительного соглашения.

Оплата взноса в размере 60 % от цены договора осуществляется в течение 7 календарных дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме.

Оставшаяся сумма выплачивается поэтапно, в соответствии с графиком платежей, до 31 марта 2023 года включительно.

Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве

Заключение договоров с дольщиками осуществляется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 года № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь».

Принятие и регистрация заявлений потенциальных дольщиков о заключении договоров осуществляется отделом собственного строительства ОАО «Минский домостроительный комбинат» через 5 календарных дней после опубликования проектной декларации, с 31 октября 2022 года до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству задекларированных квартир, по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 43, понедельник – четверг с 8.15–16.15, пятница с 8.00–15.00, обед с 12.00–12.30.

Для подачи заявления гражданину необходимо – личное присутствие, гражданский паспорт, ксерокопия паспорта стр. 25, 31, 33, для подачи заявления гражданину, состоящему на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, необходимо личное присутствие гражданина, паспорт, ксерокопия паспорта стр. 25, 31, 33, справка администрации района г. Минска о постановке на учет нуждающихся в улучшении жилищных условий со сверкой данных, юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю – документы, подтверждающие государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, юридического лица, документ, удостоверяющий личность гражданина – индивидуального предпринимателя, представителя или должностного лица, документ, подтверждающий полномочия на подписание заказа на выполнение работ (доверенность, приказ, решение, иной документ).

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет осуществляться не ранее, чем через 7 календарный день после опубликования проектной декларации, непосредственно с гражданами, подавшими заявление либо с их представителями, действующими по доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Данная проектная декларация отменяет действие предыдущих проектных деклараций, опубликованных в газете «Звязда» от 11.01.2022 № 5 (29627) и от 17.08.2022 № 160 (29782) с изменениями от 21.09.2022 № 185 (29573).

АД ПАЛАНЭЗА ДА ЗАВЕІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Уладзімір прыехаў на дэгустацыю з Уздзенскага раёна. Мужчына тры гады таму пачаў закладваць сад на набытым участку. З летнімі сартамі яблыкаў і груш пытанне ўжо закрыў. А вось з зімовымі трэба нешта вырашаць. Мужчына ўжо падрыхтаваў ямкі для таго, каб пасадзіць дзве яблыні і дзве грушы. Пакуль дакладна не вырашыў, якія. Хочацца самыя-самыя, бо месца на ўчастку засталося ўжо не так шмат.

«Я спачатку прадэгуставаў усе 20 сартоў яблыкаў і груш, — кажа Уладзімір. — Выпісаў у нататнік тыя, якія спадабаліся. Потым яшчэ раз прайшоўся па ўпадабаных сартах — каб ужо з іх выбраць адзін-два. Бо калі саджаць нешта на сваім участку, трэба быць на сто працэнтаў упэўненым, што табе гэты сорт падабаецца. З ігрыш мне запомніліся больш за ўсё «Проста Марыя» і «Ясачка». Ну і «Талгарская прыгажуня», вядома. Так супала, што якраз напярэдадні дэгустацыі жонка з працы прынесла тры грушы гэтага сорту, яе калега пачаставала. Таму я ўжо быў знаёмы з гэтым хрумсткім сакавітым смакам. Што датычыцца яблыкаў, то мой «топ» на сёння — сарты «Памяць Каваленкі» і «Паланэз». Хацеў пакаштаваць «Памяць Сікоры», але сярод прастаўленых іх не было. Пасля дэгустацыі загарэўся набыць саджанец «Проста Марыя», але не паспеў, бо іх ужо разабралі, як, прынамсі, і самі плады. «Проста Марыя», кажуць, — самая смачная восеньская груша, шэдэўр беларускай селекцыі, яе трэба абавязкова пасадзіць.

За час існавання РУП «Інстытут пладаводства» створаны 53 сарты яблык і 23 сарты груш айчыннай селекцыі.

У выніку набыў саджанец «Талгарскай прыгажуні». Плюс восем кілаграм пладоў груш гэтага сорту. Саджанец выбіраў прынцыпова на сеянцавым падвоі. Над астатнім пакуль думаю. Хацелася б пакаштаваць зімовыя сарты груш «Завея» і «Беларуская позняя», калі яны даляжаць. На дэгустацыі яны былі прадстаўлены, але каштаваць іх не было сэнсу, бо пакуль не праявілі сябе ў поўнай меры. Цудоўна, што праводзяцца такія мерапрыемствы. Я летась купляў саджанцы абрыкосу ў фермера, дык ён такі заняты быў, што не надта ахвотна адказваў на мае пытанні. А тут ніхто не адмаўляў, можна было пагутарыць з вопытнымі садаводамі, атрымаць ад іх карысныя парады».

«БОЛЬШАСЦЬ ЛЮБЯЦЬ САЛОДКІЯ. А КІСЛЫЯ — ПАД НАСТРОЙ»

Прабіцца да спецыялістаў з Інстытута пладаводства па каментарый адразу было таксама цяжка. Яны пастаянна знаходзіліся ў акружэнні цікаўных людзей. Сярод такіх — як спрактыкаваныя садаводы, так і аматары-пачаткоўцы.

— Людзі да вас падыходзяць і падыходзяць. Якія пытанні часцей за ўсё задаюць? — цікавіліся.

— У асноўным пытаюцца пра асартымент: якія сарты можна набыць, як абараніць грушу ды яблыню ад хвароб — кажа **Вольга ЯКІМОВІЧ, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства»**.

— Кагосьці цікавяць яблыкі і грушы, якія можна есці цяпер, — дадае **загадчык аддзела селекцыі пладовых культур РУП «Інстытут пладаводства» Сяргей ЯРМОЛІЧ**. — Але большасць пытаюцца пра сарты, якія захоўваюцца максімальна доўга, да лета. За апошнія гады заўважыў тэндэнцыю, што большасць людзей хочуць салодкіх яблыкаў. Гэта, на маю думку, звязана з тым, што ў 90-х гадах у нашы крамы пачалі завозіць польскія яблыкі, а яны ў асноўным салодкія. Вось з часам людзі і прызвычаіліся да гэтага смаку. Раней жа аддавалі перавагу кісла-салодкім.

— Самае частае пытанне, якое мне сёння задавалі, гэта якіх сартоў грушы падабаюцца асабіста мне, што б я парэкамендавала, — усміхаецца Вольга Якімовіч. — Але селекцыянеру вельмі складана адказаць на гэтае пытанне, бо насамрэч кожная груша смачная ў свой час. У ідэале добра, калі ў садзе ёсць яблыні і грушы ранняга, сярэдняга і позняга тэрміну саспявання. Тады амаль круглы год чалавек будзе есці свае вітаміны. З летніх груш беларускай селекцыі я рэкамендую сорт «Кудесніца» — яе плады буйныя, смачныя, сакавітыя, устойлівыя да хвароб (пры ўмове, што мы праводзім стандартныя 6—8 апрацовак). З восеньскіх — сорт «Проста Марыя», з зімніх — «Беларуская позняя», «Завея». У будучыні, спадзяюся, наш новы элітны гібрыд 07-4/33 зойме сваё месца ў групе позніх сартоў.

— Цікава, а якія сарты груш растуць у вас на ўчастку?

— «Кудесніца», «Проста Марыя» і дрэва, на якім прышчэплена некалькі розных сартоў груш. «Проста Марыя» — на сёння неперауздзеная класіка восеньскай грушы, якая расце без перабольшвання практычна ў кожным большменш маладым садзе (калісьці быў папулярны аднайменны серыял, аднак гэта груша названая ў гонар аднаго з аўтараў сорту Марыі Мялік. — **«Аўт».**). Плады падабаюцца ўсім без выключэння. Радуюць практычна да Новага года, калі захоўваць ў халадзільніку. Адзін з папулярных сартоў — «Талгарская прыгажуня» ва ўмовах Казахстана лічыцца восеньскай грушай. У нашых умовах мы яе характарызуем як позневосеньскую ці ранняземовую. Яна можа і да снежня

паляжаць. Праўда, лепш яе есці ў кастрычніку-лістападзе, калі смакавыя якасці праяўляюцца максімальна. Як і ва ўсіх сартоў груш, у яе ёсць свае перавагі і недахопы. Яна салодкая, сакавітая, хрумсткая і ўстойлівая да хвароб. Але страчвае свае смакавыя якасці пры доўгім захоўванні, у сярэдзіне снежня «прыгажуня» ўжо будзе не такая смачная. Да таго ж пры перагружанасці ўраджаю плады драбнеюць. А дробныя грушы не такія смачныя, як буйныя.

— Раскажыце пра сарты яблыкаў, якія прадстаўлены на дэгустацыі.

— Хачу звярнуць увагу на нашы новыя сарты — «Белана», «Паланэз» і «Дыямент», — кажа Сяргей Ярмоліч. — Яны не толькі маюць прыгожы таварны выгляд, але і вельмі смачныя і ўстойлівыя да хвароб. «Белана» захоўваецца ўсю зіму да чэрвеня ў звычайным падвале, гэтыя яблыкі ў працэсе лёжкі яшчэ жаўцеюць, становяцца больш салодкімі і смачнымі. «Дыямент» захоўваецца да сакавіка, але смачны і цяпер. Ён не гніе, а вяне з часам. Плюс у яго вельмі спецыфічная мякаць, якой у іншых сартах не было дагэтуль. «Паланэз» захоўваецца на працягу двух месяцаў, да лістапада. Гэта аналаг сорту «Беларускае салодкае» па смаку. Вельмі хрумсткі, сакавіты.

— Сяргей Андрэевіч, а ў вас ёсць любімы сорт яблыкаў? Што параіце тым, хто вырашыў завесці ці папоўніць свой сад?

— Усё, што ўключана ў дзяржрэестр сартоў. Спіс можна паглядзець на сайце Інстытута пладаводства. Кожны яблык па-свойму смачны ў свой час. Можна, канешне, сарваць той самы «Імант» у кастрычніку і адразу ж пачаць есці. Але ў яго цяпер не той водар і смак, які будзе пасля Новага года. Таму нічога дзіўнага, што сёння вы яго пакаштавалі і яблык вам не надта спадабаўся. Проста ён яшчэ не гатовы, не даляжаў.

— Тут прадстаўлена далёка не ўсё, што вы можаце прапанаваць спажыўцам. Як выбіралі сарты для дэгустацыі?

— Выбіралі тыя, якія можна зараз прадэгуставаць, — кажа Вольга Якімовіч. — Разам з тым у дзясятку ўвайшла і груша «Ясачка», тэрміны саспявання якой ужо выйшлі. Вы ж каштавалі, яна ўжо вельмі мяккая, аж растае ў роце. Мы ледзьве яе захавалі. Хацелася проста паказаць людзям, што ёсць такі цудоўны сорт. Груша вельмі смачная, у яе стварэнні ўдзельнічалі эталонныя «Беларуская позняя» (РБ) і «Канферэнцыя» (Вялікабрытанія). Нягледзячы на высокія смакавыя ўласцівасці, фермеры не вельмі хочуць ёй займацца, бо саджанец моцна разгаліноўваецца і патрэбна апора пры вырошчванні. У той жа час сарты «Беларуская позняя», «Завея», гібрыд 07-4/33 — свае смакавыя якасці яшчэ не праявілі. Але мы хацелі паказаць, што ў нас ёсць такія сарты груш, каб у людзей была гэта інфармацыя на слыху.

«ЯБЛЫКІ ПА 1,5 РУБЛЯ, ГРУШЫ — ПА 3»

Многім падабаюцца такія кірмашы-дэгустацыі. Чаго там толькі не пачуеш! У прыватнасці, гаспадыні дзяліліся, як яны выціскаюць яблычны сок і выкарыстоўваюць яго для закаткі памідораў замест вады. Кажуць, смак непаўторны. А адна жанчына казала іншай, што яе дыетолаг раіць есці хоць бы адзін яблык у дзень, бо там шмат пекціну. Да таго ж вельмі карысныя печаныя яблыкі. У гэтым стане пекцін актыўна выводзіць з арганізма ўсе канцэрагены. Акрамя таго, перад тым як адправіць яблыкі ў склеп на захоўванне, трэба, каб яны 5-6 сутак пастаялі ў прахалодным месцы, пры начной плюсавой тэмпературы 8—10 градусаў. Інакш разагрэтыя на сонцы плады аддадуць цяпло ў навакольле, і тэмпература захоўвання акажацца вышэйшая, чым трэба. Ідэальна, калі ў склепе 3-4 градусы цяпла.

А наогул грушамі людзі цікавіліся больш, чым яблыкамі. Відаць, таму што апошніх сёння ва ўсіх хапае. Як гарачыя піражкі разляцеліся плады сорту «Проста Марыя» і элітнага гібрыду. За дзве гадзіны да канца дэгустацыі гэтыя грушы ужо нерэальна было пакаштаваць.

Падыходжу да палаткі, дзе прадаюць яблыкі і грушы, і станаўлюся ў чаргу.

«Можна мне пару кілаграм груш «Проста Марыя?» — пытаецца мужчына з маленькім дзіцём на руках. — «Разабралі ўжо. Вазьміце «Талгарскую прыгажуню», яна таксама смачная», — адказвае касір.

Яблыкі прадавалі па 1,5 рубля за кілаграм, грушы — па 3.

— На кірмаш людзі звычайна прыязджаюць паглядзець, прыцаніцца, — кажа **Тамара ГРУШАВА, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гадавальнікаводства РУП «Інстытут пладаводства»**. — Бяруць па пару кілаграм груш ды яблыкаў на пробу. А потым у будні дзень — у нас ёсць свая крама ў Інстытуце пладаводства — прыязджаюць і скрынямі купляюць тыя сарты, якія спадабаліся, на далежванне. У нас можна купіць не толькі грушы і яблыкі, але і саджанцы. Асартымент вельмі багаты, на любы густ. Ёсць саджанцы каланавідных яблыняў, на якіх плады растуць па ствале. Вось перад вамі прыходзіў чалавек, кажа, хоча грушу на тарфяніку пасадзіць. Мы параілі, каб ён узяў на клонавым падвоі, а не на насенным. Я кожнаму пакупніку адразу задаю пытанне: «У якім раёне жывяце?» І ў залежнасці ад рэгіёна і глебы стараемся падабраць саджанец.

Пасадачнымі матэрыяламі сёння гандлююць многія. Каб не сутыкнуцца з ашуканствам, варта заўсёды цікавіцца пашпартам, які дазваляе вытворчасць і рэалізацыю саджанцаў. Акрамя таго, спытайце сартавое пасведчанне. Усе, хто сумленна працуе, маюць гэтыя дакументы. Саджанцы павінны быць без знешніх пашкоджанняў на каранях і ствале. Можна папрасіць зрабіць зрэз на карэньчыку — ён павінен мець светлую, а не карычневую афарбоўку.

На пытанне, якія пладовыя дрэўцы карыстаюцца найбольшай папулярнасцю, Тамара Грушава адзначыла, што ў асноўным саджанцы беларускай селекцыі.

— Асабіста я ў першую чаргу прапаную менавіта іх, бо яны больш адаптаваныя да нашых умоў. Пасяхова перанясуць не толькі суровую зіму, але і парадуюць салодкім ураджаем нават у дажджлівае лета. Акрамя таго, устойлівыя перад самай распаўсюджанай і небяспечнай хваробай саду — паршой. Але бяда ў тым, што садаводы-аматары не заўсёды праводзяць неабходныя апрацоўкі ад шкоднікаў і хвароб. Пасадзілі і думаюць, што дрэва будзе расці само па сабе. А потым здзіўляюцца, чаму яблыкі ды грушы нясмачныя, з чорнымі кропкамі або чарвівыя.

Карыстаючыся магчымасцю, параілася са спецыялістамі, якую сліву мне лепш пасадзіць на сваім участку. Хачу чарнаслівы, каб мякаць была тугенькая. «Вазьміце Венгерку, не пашкадуеце. Яна хутка расце, і яе плады ідэальныя для сушкі». Думаю, ранняй вясной, калі раяць садзіць костачкавыя, яшчэ вярнуся ў Самахвалавічы па «Венгерку беларускую».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.

Надвор'е

АПОШНІЯ ДНІ КАСТРЫЧНІКА ПАРАДУЮЦЬ ЦЯПЛОМ

Туман плюс дажджы і амаль плюс 20

Апошні тыдзень месяца чакаецца па-асенняму камфортным. У першай яго палове надвор'е пад уплывам атмасферных франтоў з Заходняй Еўропы, будзе пераважна пахмурнае і дажджлівае. Аднак ужо ў другой палове грэбень высокага ціску выцесніць за межы Беларусі франтальныя раздзелы. Таму ў гэтыя дні месяца нас чакае цёплае надвор'е з тэмпературным фонам у асноўным на 2—6 градусаў вышэй за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак днём часам чакаюцца дажджы. Тэмпература паветра ўдзень складзе да плюс 9—14 градусаў, а па паўднёвым захадзе — да 16 цяпла. На большай частцы тэрыторыі ў сераду таксама прагназуюцца дажджы. Ноччу і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Уначы тэмпература паветра складзе плюс 6—11 градусаў, а днём — плюс 10—16.

Цяплець пачне ўжо ў чацвер. У гэты дзень уначы і раніцай у многіх раёнах краіны пройдуць невялікія дажджы, днём будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ноччу не падымецца вышэй за плюс 5—10 градусаў, удзень — ад плюс 10 па паўночным усходзе да 17 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Пераважна без ападкаў прагназуецца надвор'е ў пятніцу. Ноччу і раніцай месцамі туман. У начныя гадзіны тэмпература складзе плюс 4—10 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 10—17 градусаў.

Па падліках айчынных метэаролагаў, перыяд антыцыклянальнага надвор'я будзе нядоўгі, і ўжо ў дзённыя гадзіны суботы месцамі па поўначы Беларусі, а ў нядзелю ў некаторых раёнах прылакальным развіцці кучава-дажджавой воблачнасці пройдуць кароткачасовыя дажджы.

Сяргей КУРКАЧ.

Вогненныя вёскі. Нельга забыць

Памяці спаленых фашыстамі паселішчаў прысвячаецца

ПОПЕЛ СТУКАЕЦЦА Ў СЭРЦЫ

Быхаўскія школьнікі на макетах аднаўляюць паселішчы, спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Апошнія два гады падлеткі актыўна прымаюць удзел у даследаваннях знішчэння мірнага насельніцтва ў рэгіёне. Нагодай сталі розныя конкурсы і акцыі рэспубліканскага і абласнога ўзроўню. А яшчэ асабісты інтарэс, які запальваюць у іх тутэйшыя настаўнікі. Яны кажуць, што не ведаць пра свой род сорамна. Асабліва пра той момант, калі яго прыніжалі і знішчалі фашысцкія нацысты. Сёння вынікі гэтай работы можна ўбачыць у Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Напярэдадні адкрыцця выставы там пабываў і карэспандэнт «Звязды».

Гісторыю ваеннага мінулага вучні школы № 2 г. Быхава вывучаюць з прывязкай да мясцовасці.

Малодшы навуковы супрацоўнік Быхаўскага гісторыка-краязнаўчага музея Алена ВЕРХАЎЦОВА пачынае экскурс у ваеннае мінулае з залы, прысвечанай падзеям Вялікай Айчыннай вайны. З сакавіка гэтага года тут з'явілася экспазіцыя аб генацыдзе. На стэлажах копіі архіўных дакументаў, якія былі перададзены пракуратурай пры даследаванні злачынстваў акупантаў, здзейсненых на тэрыторыі раёна. Акцэнт робіцца на яўрэях, бо на тэрыторыі Быхава было створана гета. У старадаўнім замку, які застаўся з часоў XVII стагоддзя, разам з яўрэямі ўтрымліваліся партыйныя работнікі, бежанцы з Заходняй Беларусі, у тым ліку палякі. Першы расстрэл адбыўся ў жніўні 1941 года, калі немцы знішчылі болей чым 250 мужчын. Пад відам удзелу ў рамонтных работах яны былі вывезены з горада і за кіламетр ад Быхава расстраляны. Гэта месца называецца Ганькаў роў, там зараз стаіць мемарыял. Праз тыдзень усіх астатніх, хто ўтрымліваўся ў замку без ежы і вады, вывезлі ва ўрочышча Маславічы, што за шэсць кіламетраў ад Быхава, і таксама расстралялі. Аблавы на яўрэяў праходзілі да снежня 1941 года. Усяго ў раёне па акце ад 1944 года было расстраляна 4679 чалавек.

Макеты школьнікаў прысвечаны вёскам, дзе з 1942 года на поўную моц лютаваў карніцкі атрад Барчыка, які ўваходзіў у эсэсаўскі батальён Оскара Дзірлевангера. Эсэсаўцы палявалі на партызан, а заадно знішчалі насельніцтва.

— На жаль, са стапрацэнтнай дакладнасцю нельга падлічыць, колькі было знішчана жыхароў, — расказвае Алена. — Запісы рабіліся са слоў відавочцаў, якія маглі нешта бачыць і паведаміць. У нас неяк працавала настаўніца, якая займаецца гэтай тэмай, і звярнула ўвагу, што некаторыя імёны не супадаюць. Падчас складання гэтых спісаў маглі перабліцаць год нараджэння і нават пол. Хлопчыка, напрыклад, запісаць як дзяўчынку, асабліва калі імёны мужчынскія і жаночыя супадалі. Але іншых звестак мы не маем. Акты падпісвалі людзі пры пасадах, якія неслі адказнасць. Сёння акты захоўваюцца ў архівах, і гэта адзінае, на што можна абапірацца.

Быхаўшчына лічылася партызанскай зонай, тут «ляснымі людзьмі» арганізоўвалася шмат дыверсій, і немцы праводзілі акцыі запалохвання. Невялічкая вёска чыгуначнікаў Залатое Дно была спалена фашыстамі пасля таго, як партызаны пусцілі непадалёк ад яе пад адхіл нямецкі цягнік. Гарадзец наогул палілі двойчы, бо там стаяў нямецкі гарнізон, і партызаны часта на яго нападалі. Карніцкія аблавы праводзіліся ў Студзёнцы, Мокрым, Ветранцы, Смаліцы. Жыхароў зганялі ў дамы або пуні і спальвалі. Людзі расказвалі, што карнікі кідалі ў вокны дамоў гранаты, а тых, хто спрабаваў уцячы, расстрэльвалі. Выжывалі адзінкі.

Тэма генацыду патрабуе ўважлівага вывучэння, аналізу, лічыць супрацоўніца музея. Інфармацыя ўдакладняецца і сёння, і тое, што ў гэтых даследаваннях прымаюць удзел школьнікі, вельмі важна. На Быхаўшчане ў выніку карных аперацый, авіяналётаў і баёў была спалена 131 вёска. Школьнікі ўвасобілі ў сваіх праектах выключна тыя, дзе з асаблівай жорсткасцю знішчалася насельніцтва.

Вёска Дабужжа ў выкананні вучняў Следзюкоўскай базавай школы.

Макеты ў выставачнай зале — нібы маленькія матэрыялізаваныя выспачкі ў бязмерным акіяне чалавечага гора. На сценах іх суправаджаюць рэпрадукцыі карцін Міхаіла Савіцкага з жахлівымі сцэнамі нямецкіх злачынстваў. Мастак сам прайшоў праз канцлагеры, на сабе выпрабаваў усю глыбіню чалавечага гора. Побач з работамі школьнікаў — таблічкі, на якіх прапісаны даты знішчэння вёсак, колькасць спаленых дамоў і жывых ахвяр. Вунь макет з відам вёскі чыгуначнікаў Залатое Дно, а вось Красніца — яе немцы палілі некалькі разоў, адзін раз з асаблівай жорсткасцю. У 1943-м знішчына было болей чым 800 жыхароў. «А маці першая ўскочыла на печ, дык лягла, за трубу галаву. І ёй — як білі, так мяса ляцела — галаву гэта абляпала ёй. Ну і білі на печ усё. Бабульку тую пасеклі — яна ўсё жывая. Маці паранілі, там пазабівалі ўсіх... Сем нас чалавек, а мы толькі ўтрох — мама і я з братам сышлі потым з печы...» — гэта толькі частка жахлівага ўспаміну жыхаркі гэтай вёскі, які ўвайшоў у твор Алеся Адамовіча, Янкі Брыля і Уладзіміра Калесніка «Я з вогненнай вёскі». Расповеды нямногіх ацалелых у той бойні відавочцаў яны запісвалі праз 30 гадоў пасля падзей. Твор — спрэс крывавая рана. Там усё ў дэталях ад першай асобы.

А вунь на макеце вёска Гарадзец, дзе людзей спалілі разам з храмам. Яе жыхары таксама сведчаць аб злачынствах сваіх забойцаў у кнізе «Я з вогненнай вёскі».

Вёска Хамічы, дзе было каля 200 дамоў, цалкам спалена ў 1944 годзе. Немцы пры адступленні спаганялі помсту на старых, жанчынах, дзецях...

— Школьнікі праводзілі даследаванні, макеты рабілі з улікам апісанняў людзей, схем населеных пунктаў, — расказвае мой гід. — Іх работы здольныя прабудзіць успаміны ў іншых або прымусіць іх нешта даведацца з мінулага свайго роду. Мая бабуля таксама ледзь не загінула. Яна жыла ў вёсцы Барсукі, якая згарэла ў выніку авіяналёту. Але карніцкія аблавы праводзіліся і тут. Яны шукалі яўрэяў, а бабуля была каравокая і цямнявая. Маці схавала яе ў пуні, закапала ў салому. Немец зайшоў туды, пачаў торкаць салому віламі і зачапіў нагу дзяўчыны. Тая завойкала, але немец нечакана прыклаў палец да вуснаў, маўляў, маўчы, і выйшаў. Дзяўчыне проста пашчасціла.

Настаўнік гісторыі быхаўскай школы № 2 Сяргей КУЛАЕЎ тэмай вайны займаецца не адзін год. У школе ён кіруе краязнаўчым гуртком і разам з дзецьмі даследуе злачынствы немцаў на тэрыторыі раёна. Разам з ім сямікласнікі Максім Каспартаў і Марыя Ларшына стварылі макеты дзвюх спаленых вёсак.

— Мы прытрымліваліся карты вёскі Дабужжа 30-х гадоў, якую знайшлі ў інтэрнэце, — расказвае Максім. — Асабіста я рабіў пад кіраўніцтвам настаўніка дамы з драўляных брускоў. Вайны ў нашай вёсцы яшчэ няма, яна атрымалася жывая, прыгожая. І калі ведаеш, які адбыўся кантраст з тым, што было, становіцца страшна.

— А я размалёўвала хаткі, рабіла нешта накшталт травы, клеіла пясок, калі стварала дарогу, — расказвае Маша. — У галаве не ўкладваецца, як нелюдзі маглі абыходзіцца так жорстка з мірнымі жыхарамі. Відавочца Аляксей Сцяпанавіч Салаўёў падрабязна расказваў, як яго цётку Ульяну Квартальную забілі палкамі, здзекаваліся з дзяцей.

Настаўнік з дзецьмі выязджаў у Дабужжа, каб яны маглі паглядзець на мясцовасці, дзе што знаходзіцца. Над макетам працавалі каля паўгода.

— Яшчэ мы ездзілі на курган, які знаходзіцца непадалёк ад вёскі, — дадае Маша. — Яго адкрылі ў 1963 годзе ў гонар партызанскага палка пад кіраўніцтвам Сяргея Грышына. Гэта камандзір таго самага знакамітага палка «Трынаццаць», які ішоў рэйдам па Смаленшчыне, Магілёўшчыне і трапіў у акружэнне. Гітлераўцы хацелі іх знішчаць у раёне вёсак Дабужжа і Боўкі. Іх блакада праходзіла каля двух тыдняў. Былі задзейнічаны танкі, авіяцыя. З-за гэтых падзей і спалілі Дабужжа, Смаліцу, Ветранку і Трылесіна.

Сяргей Кулаеў лічыць, што дзеці абавязкова павінны ведаць імёны сваіх продкаў, якія перажылі вайну. Асабіста ён разам з сынам рабіў работу на конкурс пра прадзеда Івана Кулаева, які быў родам з вёскі Трубільня Краснапольскага раёна. Баявое хрышчэнне ён прыняў у 1943-м на Проні ў раёне Прапойска (Слаўгарада), дзе фронт стаяў дзевяць месяцаў. Потым быў палон, уцёкі, блуканне па пінскіх балотах, партызаны, зноў фронт. Вызваляў Польшчу, дайшоў да Берліна, удзельнічаў у вулічных баях. Яго баявыя заслугі адзначаны ўзнагародамі, у тым ліку медалём за адвагу.

— Да дзявятага класа ў школьнай праграме нічога няма пра Вялікую Айчынную вайну, але дзякуючы нашаму краязнаўчаму гуртку дзеці яшчэ з пятага класа ведаюць пра ваенныя падзеі. Максіму пашчасціла, што гэтай тэмай цікавіліся яго маці і старэйшы брат. Марыя таксама ўжо тое-сёе ведае пра свайго дзеда. Паспрабуем разам пашукаць інфармацыю пра яго на сайтах і зрабіць работу на які-небудзь конкурс. На жаль, сёння нават бацькі нашых вучняў вельмі мала ведаюць нешта пра сваіх прадзедаў. Мы імкнёмся абудзіць у дзецях цікавасць. Яны ўдзельнічаюць у конкурсе «Мая зямля — Прыдняпроўе», традыцыйна праводзяцца перад 9 Мая конкурсы па Вялікай Айчыннай вайне. Там згадваем і пра гісторыі сваёй сям'і, школьнікі пішуць эсэ, сачыненне, ствараюць лэпбукі.

Сёлета ў Быхаўскім раёне каля вёскі Дунаёк аднавілі партызанскі лагер. У гады вайны там знаходзілася пяць партызанскіх атрадаў. Балоцістая мясцовасць, рака Грэза — проста так туды было не прабрацца. Там жа хаваліся 12 тысяч мірных жыхароў, у тым ліку жанчыны, дзеці. У 1972 годзе быў пастаўлены помнік. Зараз з'явіліся яшчэ і зямлянкі, каб перадаць дух тых часоў. Сяргей Кулаеў ездзіў туды разам са сваімі юнымі краязнаўцамі — хадзілі па тых зямлянках, дзяліліся ўражаннямі.

— Дзеці сядзелі на «ложках», выпілаваных з дрэў, і не маглі зразумець, як на гэтым спаць, калі нават сядзець нязручна, — расказвае настаўнік. — Ім было няўцям, як наогул тут людзі жылі, асабліва зімой. Мы гатавалі ежу на кастры, паспрабавалі пажыць жыццём ваеннага часу. На нас напалі ласіныя мухі, прыходзілася адбівацца. Наогул, атрымалі шмат эмоцый. Гэта, канешне, не тое, што было тады. Але нейкі мінімум з таго, што прыходзілася перажываць людзям, мы адчулі.

Сяргей Кулаеў выкладае гісторыю яшчэ і ў Макранскай школе. Там таксама ёсць музей, якім ён загадвае. Ваенная тэма там моцна прадстаўлена. Шмат інфармацыі пра падзеі на тэрыторыі раёна, у тым ліку пра 324-ю стралковую дывізію, якая вызваляла Быхаўшчыну і атрымала за гэта ганаровую назву Верхне-Дняпроўская.

Алена ВЕРХАЎЦОВА знаёміць з жахлівымі гісторыямі спаленых вёсак.

Сяргей КУЛАЕЎ з юнымі даследчыкамі.

— Пабываць у музеі можна, далучыўшыся да нашай групы «Укантакце» і «Аднакласніках», — падказвае настаўнік. — Нас глядзяць нават у Рэйк'явіку і Токіа. У школьным музеі захоўваюцца ўспаміны жыхароў вёскі Красніца. А таксама кніга Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Уладзіміра Калесніка «Я з вогненнай вёскі» з успамінамі жыхароў Студзёнкі і Гарадца.

Тэме генацыду будзе прысвечаны чарговы «Пошукавы веснік» **Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру»**. Яго **кіраўнік Мікалай БАРЫСЕНКА** адзначае, што тэма знішчэння беларускага народа патрабуе як мага больш глыбокага вывучэння. Зараз — па архіўных дакументах. У расійскіх архівах адкрываюцца засакрэчаныя даныя па гэтых справах. І інфармацыю трэба адсочваць, параўноўваць, аналізаваць.

— На сёння сітуацыя з лічбамі неакрэсленая, — кажа ён. — Калі працавалі над мемарыялам у Борках, шукалі дакладную колькасць цалкам спаленых вёсак, з жыхарамі і без, спаленых і адноўленых. Статыстыка не дае адназначнага адказу, у розных крыніцах лічбы розныя. У архіўнай даведцы па Магілёўскай вобласці ад 1984 года — копіі рашэння Магілёўскага аблвыканкама ад чэрвеня 1968 года — гаворыцца, што на Магілёўшчыне было спалена 1655 вёсак, і гэты спіс не канчатковы. Я схільны верыць гэтай даведцы, яна бліжэй да вайны, да падзей, калі яшчэ жывыя былі ветэраны. Зараз мы ўсе карыстаемся архіўнымі дакументамі і актамі надзвычайных камісій, якія складаліся з іх слоў.

— У савецкія гады лічылася, што ў Вялікай Айчыннай вайне загінуў кожны чацвёрты беларус. І гэта была аксіёма, з якой ніхто не спрачаўся, — працягвае Мікалай Барысенка. — Зараз мы гаворым пра кожнага трэцяга беларуса, які загінуў, прапаў без вестак у гады вайны. Але гэта таксама ўмоўная лічба, бо паміж кожным чацвёртым і кожным трэцім папраўка ў мільёны.

Мы дагэтуль не ведаем, колькі жыхароў загінула падчас той ці іншай карнай аперацыі. Боркі, Дабужжа, любая іншая вёска — дакладна ніхто не скажа, колькі было знішчана людзей, часам мы не ведаем з дакладнасцю да 100 і болей чалавек. У 100 працэнтах выпадкаў мы гаворым прыкладныя лічбы. І яны ідуць з успамінаў або актаў надзвычайных камісій, зробленых пасля вайны. Са слоў людзей, якія выжылі. Падлік вёўся ў тым ліку па перапісе 1939 года. Пасля вайны бралі перадваенную колькасць жыхароў і параўноўвалі з колькасцю, якая засталася. А многія былі выгнаны ў Германію, потым вярнуліся, з фронту прыйшлі тыя, якія лічыліся зніклымі без вестак. Ні ў адной сітуацыі мы не ведаем дакладных лічбаў. Вось гэта праблема. Зараз ёсць магчымасць удакладніць — адкрыліся архівы, сайты. І пракуратура правільна аднавіла справу, каб падвесці вынік знішчэнню мірнага насельніцтва. Дагэтуль адкрываюцца новыя прозвішчы злачынцаў. Шмат хто панёс пакаранне, але ж некаторыя засталіся. І нават героямі лічыліся, дзесьці набылі ўзнагароды ўдзельнікаў вайны. А самі служылі ў паліцэйскіх, карніцкіх атрадах — і гэта яшчэ адна тэма для даследавання. Не выключна, што лічба «адна траціна беларусаў» будзе іншай. Таму і актуальна сёння гэта тэма. Амерыканцы і еўрапейцы хочуць даказаць, што вайну выйгралі не мы, а яны. І гэтага нельга дапусціць. Якімі пакутамі дасталася Перамога, нельга пераацаніць. Акупанты імкнуліся знішчыць і пераўтварыць краіну ў рабскую. Захапіць рэсурсы, насельніцтва зрабіць трэцясортным і прымусіць працаваць на іх рэйх. Мы павінны прасвятляць нашу моладзь, бо яны жывуць у іншых вымярэннях. Трэба, каб яны гэтыя макеты рабілі, і па вёсках хадзілі, і ў музеях з архівамі працавалі пад кіраўніцтвам педагогаў. Толькі там можна знайсці дакладныя звесткі. Ніхто ў Еўропе пра гэта казаць не будзе. Яны там стараюцца замазаць і забыць свае злачынствы. Так быць не павінна. Побач з намі ідзе поўнамаштабная вайна. Мы пажынаем плады 1990-х, калі цэлае дзесяцігоддзе Вялікая Айчынная вайна была не папулярная, пра яе спрабавалі забыць, паглыбляліся ў далёкую гісторыю, вывучалі княствы, ВКЛ, Рэч Паспалітую. Вялікая Айчынная вайна непапулярная і нязручная для краін Захаду. На жаль, і для сённяшняй Украіны. Нездарма там героямі становяцца АУНаўцы, нацыяналісты, якія палілі і знішчалі насельніцтва і ў сябе, і тут. Яны не жадаюць бачыць тое, што тварылі на беларускай зямлі тыя ж венгры, мадзьяры — самыя жахлівыя карнікі. І гэта страшна, бо ад вайны больш за ўсё пакутуе менавіта мірнае насельніцтва. Тыя, хто ніякіх войнаў не развязвае.

Алесь Адамовіч, Янка Брыль, Уладзімір Калеснік «Я з вогненнай вёскі»:

«Пра фашызм чалавецтва ведае, здаецца, усё. Попел мільёнаў ахвяр яго стукаецца ў сэрцы людзей. І ўсё ж дзе-нідзе спрабуюць зноў і зноў абяліць гэтую чуму XX стагоддзя — у вачах новых пакаленняў, якія самі не перажылі жахаў Другой сусветнай вайны. Вунь колькі «навуковых прац» друкуецца на Захадзе пра Гітлера і яго зграю, колькі кніг і артыкулаў, аўтары якіх хто як можа імкнецца надаць «чалавечыя» рысы нацызму, памяць народаў падмяняючы рэваншысцкай нудой генералаў, былых прыслужнікаў фюрара.

Аднак ёсць яна, народная памяць, — жыве непадкупная памяць аб фашызме гестапаўскім, канцлагерным, хатынскім. Суд народаў не скончыўся ў Нюрнбергу. Ён працягваецца — у памяці народнай. Суд гэты неабходны не толькі ў імя гістарычнай справядлівасці. Ён патрэбен жывым. Тым, каму пагражаюць будучыя «фюрары». Нездарма гаворыцца, што той, хто не памятае свайго мінулага, асуджаны перажыць яго зноў...»

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

г. Быхаў.

Извещение о проведении **29 ноября 2022** года торгов с условиями по продаже жилых помещений (квартир), принадлежащих ОАО «Минский домостроительный комбинат»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)			
№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Начальная цена, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1	Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-5 (2-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 67,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 70,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812536); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-106 (1-й подземный этаж, площадь – 17,5 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812780)	205 091,43	5 000,00
2	Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-48 (1-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 65,4 кв. м, общая площадь по СНБ – 68,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812579); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-151 (1-й подземный этаж, площадь – 17,0 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812825)	204 666,95	5 000,00
3	Квартира по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-69 (6-й этаж, двухкомнатная, общая площадь – 63,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 66,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812600); машино-место по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 71Б-164 (1-й подземный этаж, площадь – 16,4 кв. м, инвентарный номер 500/D-798812838)	192 087,56	5 000,00
4	Квартира по адресу: г. Минск, ул. Неманская, 25-202 (3-й этаж, трехкомнатная, общая площадь – 77,5 кв. м, общая площадь по СНБ – 80,7 кв. м, инвентарный номер 500/D-707998017)	184 701,25	5 000,00

Продавец имущества: ОАО «Минский домостроительный комбинат», ул. Пономаренко, 43, 220015, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. Карла Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условия торгов:

1. победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов;

2. расходы, связанные с государственной регистрацией договора купли-продажи и основанных на нем прав, оплачиваются победителем торгов (покупателем).

Першая «фішка» залы — яе размяшчэнне проста пад музеем, у падвале. З бойкіх радкоў верша «Вельмі здзівім зараз вас залай незвычайнай — пасялілася ў нас нечысць віртуальная», якія дэкламуюць юныя экскурсаводы, пачынаецца маленькае падарожжа ў свет беларускага фальклору. Першае аддзяленне залы насяляюць водныя істоты: Вадзяны Дзед, Русалка, Ціхоня. «Дарэчы, першы — вечны халасцяк, ніколі не жэніцца, але ў Русалкі ад яго нараджаюцца вадзянятки. Жывуць нядоўга, да паўналецця, пасля паміраюць», — з усмешкай адзначае Людміла Нікіціна. А яшчэ расказвае, што ў беларускіх Русалак былі не хвасты, а ногі (пасля русалчынага тыдня дзяўчаты выходзілі з вады і падоўгу гушкаліся на дрэвах). Пераходзім у другое аддзяленне залы, дзе ўладараць наземна-падземныя нячысцікі. Звыклыя для нас чарцяняты ў нашых продкаў называліся шэшкамі, якія былі вёрткімі і рухавымі, а вось Начніца — дух у выглядзе жанчыны, які прыходзіў са злым намерам да дзяцей, што дрэнна спяць, — вонкава поўнасцю адпавядае апісанню. Але галоўнай гаспадыняй гэтага міфалагічнага царства з'яўляецца Ягіня (менавіта так істота называлася ў беларусаў), якая, у адрозненне ад сваёй рускай сястры Бабы Ягі, лётае не толькі ў ступе, але і на лапаце, мятле. Толькі ў Заронаўскім музеі яна ажывае (ролю Ягіні выконваюць экскурсаводы), разам з наведвальнікамі варыць суп з курыных лапак і змей, а пасля прапануе пакаштаваць. Вядома, на такі вясковы экстрым адважваюцца нямногія — і дарма, бо «ўсіх ведзьмаў цётка» хутка мяняе страву на смачную. На печы жыве Дамавік — вялікі чорны змей, такі, якім яго і ўяўлялі беларусы. А са сцяны насупраць усміхаецца бог зімы Зюзя, у якога ў музейнай інсталяцыі нават свецяцца вочы. Сказаць, што зала інтэрактыўная — не сказаць нічога, бо экскурсія суправаджаецца не толькі каляровым святлом, але і гукамі, уласцівымі нячысцікам. Дарэчы, яны, як распавядаецца ў кнізе Нікіфароўскага, могуць ператварацца ў розныя прадметы і вобразы, але ніводная з істот, якіх стварылі ў музеі, нястрашная: нячысцікі ў наведвальніка выклікаюць замілаванне, а не агіду.

Над залай беларускай міфалогіі працавалі дружным музейным актывам. А ўсё мастацкае афармленне, 3D-выявы істот на сцэнах — работа выпускніцы Заронаўскай школы Наталлі Шыкаровай, якая сёння працуе настаўніцай працоўнага навучання і мастацтва ў Суйкаўскай школе. На дасягнутым, дзеліцца Людміла Нікіціна, спыняцца не збіраюцца: летам плануюць размаляваць вонкавыя сцены, а яшчэ ўстанавіць на вуліцы рухомыя выявы нячысцікаў.

Наведаць музей трэба абавязкова, бо дзе яшчэ сустрэнеш каларытную жывую Ягіню, пакаштуеш міфічных прысмакаў і зробіш сэлфі з Ціхоняй, а яшчэ — у літаральным сэнсе дакранешся да звышнатуральнага і невытлумачальнага?

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

Спадчына

«ПАЛАСАЦІКІ» ЗНОЎ У ТРЭНДЗЕ

Старажытнае ткацтва ўсё часцей упрыгожвае сучасны інтэр'ер

Здаецца, надыходзіць час, калі мы пачынаем даставаць з бабуліных куфэркаў саматканыя посцілкі, дываны, палавікі і ручнікі. Сапраўды, з густам падабраныя традыцыйныя рэчы могуць зрабіць нашу кватэру альбо дом асабліва ўтульным і арыгінальным. Магчыма, многія яшчэ аддаюць перавагу хайтэку і мінімалізму ў інтэр'еры. Але заўважана, што саматканыя рэчы ўсё больш заваёўваюць нашу жылую прастору. Верагодна, тое адбываецца яшчэ і таму, што старадаўняе рамяство актыўна прапагандуецца, захоўваецца і аднаўляецца.

Напрыклад, нядаўна з фондаў Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея ў філіяле «Гарадніца» выстаўлены ўнікальныя ткацкія вырабы, якія былі характэрныя толькі для Панямоння. Гэта белыя і пераборныя ручнікі, падвойныя дываны, шматнітовыя посцілкі, абрусы і паясы. Трэба сказаць, што народны тэкстыль Гродзеншчыны мае сваю выразную рэгіянальную распазнавальнасць, характэрныя мастацкія рысы.

У чым яны праяўляюцца? Па словах **навуковага супрацоўніка аддзела народнай творчасці Алены САРОКІ,** адрозніць «гродзенскі» тэкстыль нескладана. Мы падыходзім да вельмі прыгожай калекцыі ручнікоў. Як патлумачыла экскурсавод, так званыя шматнітовыя вырабы вылучае дасканаласць рэльефнай структуры вытканай тканіны. На канцах ручнікоў — узоры крыжыкам і гладдзю. Пазней іх дапаўнялі тканым пераборным бардзюрам з раслінными матывамі.

— Вось узор пераборнага ручніка. Ён адметны вертыкальнай кампазіцыяй у адзін рад альбо некалькімі аднолькавымі паслядоўна. Для іх характэрная вертыкальная кампазіцыя — раўнамерна размешчаныя ў адзін ці некалькі радоў выявы ромбаў, разетак, зорачак, кветак. Самы папулярны матыў — дрэва жыцця. На вясельным ручніку гродзенскай майстрыхі Алены Шапель змешчаны зорачкі — сімвал дзіцяці, — расказвае Алена Сарока.

У сувязі з гэтым прыгадалася знаходка ў вёсцы ў мамінай шафе. З паліцы дасталі цэлы стос саматканых ручнікоў. Большасць з іх — звычайныя льняныя дарожкі з вышыўкай, але ёсць некалькі менавіта з вертыкальным узорам у выглядзе невялікіх квадратаў. Не іначай, як гродзенскі пераборны ручнік. У маёй гарадской кватэры ён упрыгожвае драўляны стол, які, дарэчы, застаўся яшчэ ад бабулі. Стол пафарбавалі, але ўсё роўна відаць, што ён стары, і гэта робіць пакой вельмі ўтульным. Цяпер задалася мэтай набыць тканыя посцілкі. Але не простыя, а падвойныя. Як аказалася, яны ў свой час з'яўляліся візітоўкай народнага ткацтва Панямоння. А прыйшлі такія падвойныя ці двухасноўныя дываны ў сялянскі быт у другой палове XIX стагоддзя. Для іх патрэбныя шырокія ткацкія станкі, спецыяльныя навыкі. Таму заказвалі іх у асноўным заможныя сяляне для вясельнага пасагу. Але паступова гэтай тэхнікай авалодалі многія вясковыя жанчыны.

— У міжваенны перыяд даследчыкі назвалі падвойныя дываны «гродзенскімі», бо яны вырабляліся паблізу Гродна. Нават ёсць меркаванне, што тут у перадваенны час магла існаваць рамесная майстэрня падвойных дываноў з багатым асартыментам вырабаў высокага мастацкага ўзроўню, — паведамілі супрацоўніца музея.

У другой палове XX стагоддзя падвойныя дываны ткалі ў Гродзенскім, Свіслацкім, Мастоўскім, Зэльвенскім раёнах, а таксама ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці. У вёсках каля Гродна такія вырабы называюць «ткацкія дываны». А самай вядомай ткачыхай, якая іх ткала на Гродзеншчыне, была Ядвіга Райская з вёскі Адэльск Гродзенскага раёна. На выставе мне давялося ўбачыць дыван, які майстрыха выткала ў 1989 годзе. Ён вытрыманы ў зялёна-шэрых адценнях. Цэнтральнае поле дывана запоўнена буйнымі стылізаванымі раслінными матывамі, акантоўка з дробных геаметрычных і раслінных узораў, па краі аздоблены махрамі. Сёння такія дываны — сапраўдны рарытэт, а некалі ткалля іх вырабляла за зіму да дзесяці, гэтым і зарабляла сабе на жыццё. Умела ткаць да дванаццаці ўзораў, заказвалі ў асноўным у жоўта-бардовых, чорна-чырвоных, зялёна-чырвоных, бела-бардовых тонах. На ўсіх яе дываны ёсць дата вырабу. Налета да 100-гадовага юбілею з дня нараджэння майстрыхі музей будзе ладзіць выстаўку яе вырабаў.

У наш час падвойныя дываны ткуць толькі асобныя майстрыхі, расказала супрацоўніца музея. Такую традыцыю аднавілі ў вёсках Гудзевічы Мастоўскага раёна і Падбела Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці. Дарэчы, тэхналогія падвойнага ткацтва ў 2011 годзе ўнесена ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як нацыянальная каштоўнасць.

На выстаўцы даволі шмат вырабаў, якія дайшлі з 1960-х гадоў. Тады з'явіліся розныя дэкаратыўныя ніткі, штучны шоўк, ірыс, мулінэ. Вырабы насілі дэкаратыўны характар, упрыгожвалі пакоі.

Звяртаю ўвагу і на тканыя палавікі. Яны цяпер зноў у трэндзе. Ад работніка музея даведваюся, што такія палавікі на Гродзеншчыне мелі сваю адметнасць. Гэта пераход ад светлага колеру да больш цёмнага ў спалучэнні з шырокімі манахромнымі палоскамі. У ткалляў былі папулярныя так званыя вясёлкавыя ўзоры. Іх самі майстрыхі называлі «паласацікамі». Дарэчы, такімі стракатымі ўзорамі ткалі і дываны. Пэўна, іх нямала захоўваецца ў вёсках. Здаецца, традыцыя вяртаецца і ў гарады. Сапраўды, чаму не засцілаць такімі дыванамі канапы, тахту ці ложак замест сінтэтычных пледаў? Апошнім часам ткацкія вырабы можна набыць падчас кірмашоў, свят альбо проста зрабіць заказ у цэнтры рамёстваў таго ці іншага раёна.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

ПРАВИЛА РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«ВЫИГРЫВАЙ С ONLINER 30»

Настоящие правила проведения рекламной игры (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), определяют порядок проведения рекламной игры «Выигрывай с Onliner 30» (далее – Рекламная игра).

В настоящих Правилах нижеперечисленные термины имеют следующие значения:

Интернет-сайт Организатора – размещенный в глобальной сети Интернет-сайт (интернет-ресурс), расположенный по адресу https://www.onliner.by.

Пользователь – физическое лицо, использующее интернет-сайт Организатора и соглашающееся с Правилами пользования ресурсом (https://blog.onliner.by/siterules).

Учетная запись (профиль) – хранимая в компьютерной системе совокупность данных о пользователе сайта, необходимая для его аутентификации и предоставления доступа к его личным данным и настройкам.

1. Организатор и Заинтересованное лицо Рекламной игры

1.1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Онлайнер», юридический адрес: 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190657494, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом 25.06.2014.

1.2. Заинтересованное лицо Рекламной игры: общество с ограниченной ответственностью «ЭлкоТелеком», юридический адрес: 220090, г. Минск, Логойский тракт, 22а, офис 41, комната 2, зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190751103, свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 08.09.2006.

2. Наименование Рекламной игры

2.1. Настоящая рекламная игра называется «Выигрывай с Onliner 30».

3. Территория проведения Рекламной игры

3.1. Рекламная игра проводится на территории Республики Беларусь.

4. Срок начала и окончания Рекламной игры

4.1. Рекламная игра проводится с 01.11.2022 по 10.01.2023 (включая период проведения розыгрыша, вручения призов и публикацию результатов проведения Рекламной игры).

5. Цель проведения Рекламной игры

5.1. Рекламная игра проводится с целью стимулирования написания отзывов об автомобилях на интернет-ресурсе https://www.onliner.by.

6. Комиссия по проведению Рекламной игры

6.1. Для проведения Рекламной игры Организатор создает комиссию по ее проведению (далее – Комиссия), осуществляющую контроль за соблюдением установленных Правил.

6.2. Состав Комиссии:

Председатель Комиссии:

- Кажуро Денис Петрович, ООО «Онлайнер», директор.

Члены Комиссии:

- Голуб Герман Юрьевич, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник управления коммерции;

- Ляшкевич Никита Александрович, ООО «Онлайнер», заместитель директора – начальник отдела маркетинга;

- Назаренко Лилия Александровна, ООО «Онлайнер», маркетолог отдела маркетинга;

- Кузьмина Дарья Андреевна, ООО «ЭлкоТелеком», ведущий специалист по продажам.

7. Участники Рекламной игры

7.1. Участник – физическое лицо, являющееся зарегистрированным пользователем сайта https://www.onliner.by, выразившее желание принять участие в Рекламной игре на условиях, предусмотренных в настоящих Правилах.

7.2. В Рекламной игре могут принимать участие совершеннолетние граждане Республики Беларусь, а также совершеннолетние иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

7.3. Участниками Рекламной игры не могут быть лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором, члены комиссии, супруг (супруга) таких лиц, их близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

8. Порядок участия в Рекламной игре

8.1. Для участия в Рекламной игре Участник должен:

8.1.1. зарегистрировать на интернет-ресурсе https://www.onliner.by учетную запись (профиль) на заявленных администрацией сайта условиях (https://blog.onliner.by/siterules);

8.1.2. подтвердить свое согласие на участие в Рекламной игре в панели управления учетной записи пользователя на интернет-сайте Организатора – https://www.onliner.by. При этом в специальных полях указать свои достоверные персональные данные – фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) полностью;

8.1.3. в период с 01.11.2022 по 30.11.2022 (включительно) оставить отзыв о любом автомобиле, представленном в разделе сайта https://ab.onliner.by/reviews.

8.2. Отзыв должен соответствовать марке и модели автомобиля, о котором пишет автор; содержать не менее 20 (двадцати) слов с информацией о впечатлениях, оставленных от владения и эксплуатации указанным автомобилем; написан русским/белорусским литературным языком согласованными предложениями; соответствовать требованиям морали, не допускается использование ненормативной лексики, жаргонных выражений, оскорблений и т. п.; не должен повторять содержание ранее опубликованных отзывов на сайте Организатора либо на иных сторонних интернет-ресурсах.

Организатор не несет ответственность за достоверность содержащихся в отзыве сведений. Отзыв является сугубо субъективным мнением его автора.

8.3. Участниками Рекламной игры становятся пользователи, которые выполнили приведенные в п. 8.1 – 8.2 условия, отзывы которых прошли успешную модерацию (проверку) со стороны Организатора и были опубликованы на сайте https://www.onliner.by в период с 01.11.2022 по 01.12.2022 (включительно). Пользователи, отзывы которых были отклонены Организатором по причине их несоответствия настоящим Правилам, к участию в Рекламной игре не допускаются.

8.4. При оставлении отзыва пользователь в течение 30 минут после его написания получит на адрес электронной почты, указанный при регистрации на сайте https://www.onliner.by, письмо, в котором будет содержаться информация об уникальном номере, присвоенном отзыву. Уникальный номер присваивается автоматически и соответствует дате и времени оставления пользователем отзыва на сайте Организатора. После проверки комментария на предмет его соответствия настоящим Правилам Организатор уведомит автора об опубликовании либо отклонении (удалении) отзыва посредством сообщения, которое будет транслироваться пользователю в его учетной записи на сайте https://www.onliner.by в срок до 01.12.2022 (включительно).

8.5. В ходе проведения Рекламной игры каждый Участник может опубликовать не более 5 (пяти) отзывов. В случае если Участник разместит большее количество отзывов, к участию в Рекламной игре будут допущены первые 5 (пять) опубликованных отзывов. Отзывы Участника отсортируются в порядке возрастания по дате и времени их оставления на сайте Организатора.

9. Призовой фонд

9.1. Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Организатора, а также имущества Заинтересованного лица в размере **2327** (две тысячи триста двадцать семь) белорусских рублей **22** (двадцать две) копейки.

9.2. Призовой фонд Рекламной игры:

	Наименование приза	Количество, шт.	Стоимость за ед., бел. руб.	Всего стоимость, бел. руб.	Ставка НДС	Сумма НДС, бел. руб.	Всего стоимость, бел. руб.
Приз	Мобильный телефон (смартфон) TECNO SPARK 8C 4GB/64GB Diamond Grey(KG5n)	9	245,89	2213,01	Без НДС	–	2213,01
	денежные средства в размере		12,69	114,21	–	–	114,21
Итого:							**2327,22**

10. Время и место проведения розыгрыша призового фонда Рекламной игры

10.1. Розыгрыш призового фонда проводится 09.12.2022 в 12:00 в присутствии Комиссии по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, ООО «Онлайнер».

10.2 Розыгрыш проводится среди Участников, надлежаще выполнивших условия участия в Рекламной игре, в соответствии с требованиями настоящих Правил.

11. Порядок проведения розыгрыша призового фонда и определения Победителей Рекламной игры

11.1. До момента проведения розыгрыша призов Комиссия формирует Список Участников Рекламной игры, успешно выполнивших все условия настоящих Правил. Список формируется в порядке возрастания по дате и времени оставления Участниками отзывов об автомобилях. Каждому такому отзыву в Списке присваивается свой итоговый порядковый номер, который является соответствующим Игровым кодом Участника. Нумерация Игровых кодов осуществляется с 1 (единицы).

11.2. Список включает в себя следующую информацию о допущенных к розыгрышу Участниках: Игровой код Участника; уникальный номер отзыва; дату и время оставления отзыва; дату и время опубликования отзыва; дату и время, когда пользователь подтвердил свое желание принять участие в Рекламной игре; фамилию, инициалы либо имя и отчество (при наличии) Участника полностью.

11.3. Для проведения розыгрыша используется лототрон, состоящий из одной секции, и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 до 9.

11.4. Определение выигрышных Игровых кодов получателей призов происходит путем их формирования слева направо из номеров шаров, поочередно извлекаемых из секции лототрона. Розыгрыш начинается с определения первого разряда Игрового кода Победителя слева.

11.5. Первый разряд Игрового кода Победителя определяется следующим образом: в секцию лототрона загружаются шары с номерами от 0 до цифры, соответствующей первому разряду зарегистрированного Игрового кода. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в сектор лототрона загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенному списку Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из секции лототрона извлекается шар, номер которого определяет очередную цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол.

11.6. Выигравшим приз в розыгрыше считается Игровой код Участника, определенный согласно п. 11.3 – 11.5 настоящих Правил, и каждый 20-й (двадцатый), следующий за ним в Списке, в количестве 8 (восьми) Игровых кодов. Всего разыгрывается 9 (девять) призов.

В случае если выигрышный Игровой код Участника приходится на конец Списка, дальнейшее исчисление Игровых кодов продолжается с начала Списка.

11.7. Результаты розыгрыша фиксируются в протоколе, который подписывается всеми присутствующими членами Комиссии.

12. Сроки и порядок уведомления Победителей о результатах розыгрыша призов Рекламной игры

12.1. Организатор в течение 7 (семи) календарных дней с момента проведения розыгрыша уведомляет Победителей о выигрыше письмом, высланным на электронную почту, указанную Победителями при регистрации профиля на сайте https://www.onliner.by. Организатор также вправе дополнительно уведомлять Победителей любым удобным ему способом: посредством SMS-рассылки на номер телефона, звонком по телефону и др.

13. Порядок получения выигрышей

13.1. Для получения приза Победители должны явиться не позднее 10.01.2023 (включительно) по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, предварительно связавшись с Организатором по номеру многоканального телефона: + 375 29 514 35 24.

13.2. Получить приз можно с понедельника по пятницу с 10:00 до 17:00 (исключение составляют приходящиеся на официальные праздники дни), а также в субботу 17.12.2022 с 10:00 до 13:00. При получении приза Победитель предъявляет документ, удостоверяющий личность (паспорт – для граждан Республики Беларусь; вид на жительство в Республике Беларусь – для иностранных граждан и лиц без гражданства).

Победитель при получении приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, предоставленные Организатором, связанные с получением приза.

13.3. В случаях невозможности связаться с Победителем для уведомления о выигрыше указанными в п. 12.1 способами; неявки Победителя за получением приза в определенный в п. 13.1 срок; указания недостоверных персональных данных в панели управления учетной записи (профиде) пользователя на интернет-сайте Организатора; непредоставления Организатору сведений и документов, необходимых для получения приза; письменного отказа от получения приза либо отказа от подписи в документах, подтверждающих передачу приза, – Победитель лишается права на получение приза. В этих случаях приз остается в распоряжении Организатора и может быть использован им по собственному усмотрению.

13.4. В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор выступает налоговым агентом и при вручении Победителю выигрыша обязан удержать у последнего причитающиеся денежные средства в качестве уплаты подоходного налога с получателя приза.

13.5. Расходы, связанные с проездом Победителя к месту получения приза, Организатором не возмещаются.

13.6. Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется.

13.7. Приз не подлежит выдаче Победителю иначе как в порядке, предусмотренном настоящими Правилами.

14. Информация о Рекламной игре, публикация правил Рекламной игры

14.1. Правила подлежат опубликованию до начала проведения Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.2. Результаты Рекламной игры будут опубликованы в срок до 31.12.2022 (включительно) в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

14.3. Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на сайте Организатора – https://www.onliner.by (https://b2bblog.onliner.by), а также по номеру многоканального телефона: + 375 29 514-35-24. Звонок платный, в соответствии с тарифами оператора электросвязи, услугами которого пользуется Участник.

15. Общие условия Рекламной игры

15.1. Участие в рекламной Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участника с настоящими Правилами, принятие на себя обязательств по соблюдению всех условий и требований. Несоблюдение Участником требований настоящих Правил признается как его отказ от участия в Рекламной игре.

15.2. Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участник соглашается с использованием его персональных данных в публикациях, связанных с опубликованием результатов Рекламной игры в газете «Звязда» и на сайте Организатора – https://www.onliner.by.

15.3. Организатор вправе отстранить Участника от участия в Рекламной Игре, отказать в выдаче Приза при нарушении последним требований настоящих Правил.

15.4. Ответственность за полноту и достоверность сведений, персональных и иных данных возлагается на Участника.

15.5. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги по подключению к сети Интернет Участника), операторов сотовой подвижной электросвязи и организаций, оказывающих услуги интернет-эквайринга (отсутствие соединения с оператором, интернет-эквайринга и т. д.), а также электронных почтовых сервисов (несвоевременная доставка оповещений на электронную почту и т. д.).

15.6. При наличии споров между Организатором и Участником Рекламной игры они разрешаются в установленном законодательством Республики Беларусь порядке.

15.7. Претензии по вопросам проведения Рекламной игры принимаются Организатором по адресу: Республика Беларусь, 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 100/7, 2-й этаж, а также посредством электронной почты game30@onliner.by.

Свидетельство № 4249 о государственной регистрации Рекламной Игры выдано 17 октября 2022 года Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

СБЕР БАНК

Просп. Независимости, 32А-1, 220030, г. Минск.
Тел.: 148 в стационарной и 5-148-148 в мобильных сетях;
тел./факс 210-03-42.
E-mail: inbox@sber-bank.by. Веб-сайт: www.sber-bank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
30 сентября 2022 года

Открытое акционерное общество «Сбер Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	Пункт приме-чаний	30.09.2022	31.12.2021
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		284 042	158 591
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		1 759	5 574
4	Средства в Национальном банке	1103		1 004 218	579 627
5	Средства в банках	1104		393 805	484 372
6	Ценные бумаги	1105		776 512	937 692
7	Кредиты клиентам	1106		2 389 887	2 576 785
8	Производные финансовые активы	1107		10 664	2 660
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		9 550	10 131
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		294 695	188 959
11	Доходные вложения в материальные активы	1110		590	680
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111		29	-
13	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
14	Прочие активы	1113		40 874	25 242
15	ИТОГО активы	11		5 206 625	4 970 313
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
17	Средства Национального банка	1201		-	-
18	Средства банков	1202		1 413 243	1 021 630
19	Средства клиентов	1203		2 654 917	2 777 973
20	Ценные бумаги банка	1204		197 692	345 029
21	Производные финансовые обязательства	1205		385	2 439
22	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
23	Прочие обязательства	1207		148 859	41 174
24	ВСЕГО обязательства	120		4 415 096	4 188 245
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
26	Уставный фонд	1211		73 585	73 585
27	Эмиссионный доход	1212		-	-
28	Резервный фонд	1213		73 902	72 397
29	Фонды переоценки статей баланса	1214		21 002	24 117
30	Накопленная прибыль	1215		623 040	611 969
31	ВСЕГО собственный капитал	121		791 529	782 068
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		5 206 625	4 970 313

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за 30 сентября 2022 года

Открытое акционерное общество «Сбер Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Сим-вол	Пункт приме-чаний	30.09.2022	30.09.2021
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		339 695	241 974
2	Процентные расходы	2012		157 425	112 842
3	Чистые процентные доходы	201		182 270	129 132
4	Комиссионные доходы	2021		117 417	130 136
5	Комиссионные расходы	2022		37 749	37 683
6	Чистые комиссионные доходы	202		79 668	92 453
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		2 611	2 155
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(1 065)	(2 588)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		94 081	31 558
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(18 240)	4 272
11	Чистые отчисления в резервы	207		75 538	(42 094)
12	Прочие доходы	208		20 073	75 644
13	Операционные расходы	209		156 151	201 453
14	Прочие расходы	210		5 723	7 224
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		121 986	166 043
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		22 025	35 558
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		99 961	130 485
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22			
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23			

Председатель Правления И.А. Меркулов

Главный бухгалтер Банка – директор департамента И.Р. Клинцов

Дата подписания: 6 октября 2022 г.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 4 от 28.08.2021 г. УНП 100219673 ОАО «Сбер Банк»

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Гродненская табачная фабрика «Неман». Аукцион состоится 24.11.2022 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: - пакетирующий автомат ЗС.154 для упаковки сигарет с фильтром № 1. Зав. № 2180510, 2002 года выпуска; - пакетирующий автомат ЗС.154 для упаковки сигарет с фильтром № 2. Зав. № 2180511, 2002 года выпуска; - пакетирующий автомат ЗС.154 для упаковки сигарет с фильтром № 3. Зав. № 2180512, 2002 года выпуска; - пакетирующий автомат ЗС.154 для упаковки сигарет с фильтром № 4. Зав. № 2180513, 2002 года выпуска; - пакетирующий автомат ЗС.154 для упаковки сигарет с фильтром № 6. Зав. № 2180515, 2002 года выпуска; - запасные части к сигаретной линии «SIGMA-8000/GAMMA/MFT8-SR». Условия проведения аукциона: победитель аукциона обязан оплатить имущество в форме 100 % предварительной оплаты в течение 15 банковских дней с момента заключения договора купли-продажи; вывоз имущества со клада Продавца осуществляется за счет покупателя, погрузка осуществляется силами Продавца; имущество поставляется без упаковки в частично разобранном виде; возможна оплата предмета аукциона в иностранной валюте по официальному курсу соответствующей валюты к белорусскому рублю, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день подписания протокола о результатах аукциона
Начальная цена продажи	2 064 722,75 руб. (два миллиона шестьдесят четыре тысячи семьсот двадцать два рубля семьдесят пять копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	206 472 руб. (двести шесть тысяч четыреста семьдесят два рубля)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – **22.11.2022 г. до 15.00**
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony	

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

Организатор публичных торгов (аукциона)	**ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 3Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by**
Продавец	**ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29**

Предмет публичных торгов (аукциона)

Лот, №	Наименование	Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %	Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 %
1	**Машино-место № 589** с кадастровым номером 500/D-708014134, площадью 15,6 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Тимошенко, д. 8-589	9 662,40	4 666,67

Задаток 5 % от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота либо цены за лот, складывающейся в ходе торгов.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после публичных торгов (аукциона)

Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 10 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by, www.iin.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,7 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

Дата и время проведения торгов (аукциона):
24.11.2022 начало торгов 10.00, окончание торгов 16.00.
Электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке https://iintorgi.by

Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 23.11.2022 г. до 17.00**
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95. E-mail: e.pinchuk@iin.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС (20 %), бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Кран-манипулятор телескопический ДЭМ-151 «UNIC», на шасси колесного трактора МТЗ «Беларус 82П», 2008 г. в., регистрационный знак ОВ-5 3974, заводской № 80205259	119454	48 288,00	4 828,00
2	Очиститель каналов навесной ОКН-05, 2012 г. в., зав. № 119, на шасси колесного трактора МТЗ «Беларус-1221В.2», 2012 г. в., заводской № 12036136	119597	64 704,00	6 470,00
3	Автомобиль автобус вагон ГАЗ-32213 «ГАЗель», 2008 г. в., регистрационный знак АС 0341-5, кузов № 32210090415447, Х9632213090639308, цвет бело-синий	8213	2 208,00	220,00
4	Автомобиль грузовой цистерна-топливозаправщик ГАЗ-52 АТЗ 2.4-52, 1988 г. в., регистрационный знак АО 3996-5, цвет зеленый, рама № ХТН520100J1100443	115272	2 304,00	230,00
5	Автомобиль грузопассажирский вагон УАЗ-390995-312, 2009 г. в., регистрационный знак АІ 4358-5, кузов (рама) № ХТТ390995904688891, 37410080490183, цвет темно-зеленый	119471	3 168,00	316,00
6	Плуг кустарниково-болотный ПБН-75	5036	1 248,00	124,00
7	Плуг ППО-4+1-40КЗ (без модуля)	5040	5 280,00	528,00
8	Плуг ППО-4+1-40КЗ (без модуля)	5041	5 856,00	585,00
9	Плуг ПГП 7-40М		2 688,00	268,00
10	Плуг ППО-4+1-40КЗ (без модуля)	119460	4 512,00	451,00
11	Плуг болотный ПБН 3-50А	119593	2 208,00	220,00
12	Станок консольно-фрезерный горизонтальный 6Р83Г	200059	3 456,00	345,00
13	Станок для резки арматурной стали С-370А	200422	1 152,00	115,00
14	Станок токарно-винторезный 1В62Г	200481	3 936,00	393,00
15	Выпрямитель сварочный ВД-306М1	200796	796,80	79,00
16	Машина контактной сварки «DALEX» SL 202	200800	4 416,00	441,00
17	Машина контактной сварки «DALEX» SL 202	200803	4 416,00	441,00
18	Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3»	200811	614,40	61,00
19	Ножницы гидравлические листовые с наклонным ножом НП3716	200812	4 896,00	489,00
20	Гидравлический пресс гибочный НР-01 с ЧПУ	200817	8 736,00	873,00
21	Станок универсальный кузнечный UMT-04K с ЧПУ	200818	7 200,00	720,00
22	Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3»	200823	460,80	46,00
23	Станок отрезной маятниковый СОМ-400Б	200824	489,60	48,00
24	Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3»	200836	537,60	53,00
25	Инверторный сварочный полуавтомат «Mitech» MIG350 IGBT	200839	1 632,00	163,00
26	Универсальный трубогибочный станок УГС-6/1	200856	4 416,00	441,00
27	Станок ленточнопильный по металлу «Bernardo» MBS 300DG	200860	6 240,00	624,00
28	Инверторный сварочный полуавтоматический аппарат «JASIC» MIG350 (J72)	200868	1 920,00	192,00
29	Полуавтоматическая трубогибочная машина «GMACC» GM-SB-76NCB, серийный № 13237	200871	17 280,00	1 728,00
30	Станок вертикально-сверлильный 2Н125Л	201006	1 440,00	144,00
31	Станок токарно-винторезный 1М63Ф101	201011	4 416,00	441,00
32	Установка газовой резки металла НСВ 1200х2000	200862	4 512,00	451,00
33	Стол для газопламенной резки металла	200867	1 152,00	115,00

Начальная цена снижена на 20 %.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BP SB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не установлено договором купли-продажи.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 08.09.2022.

Аукцион состоится **10.11.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **09.11.2022** до **17.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра: 8 (029) 351 10 33.

УНП 600077220

Спорт-тайм

ДВА БЕЛАРУСКІЯ «ЗУБРЫ» ВЫСТУПЯЦЬ У МАТЧЫ ЗОРАК КХЛ

У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем самыя цікавыя навіны апошніх дзён

МЕДАЛІ ТЫДНЯ. У грузінскім Кабулеці адбыўся галоўны турнір года для шашыстаў — чэмпіянат свету па шашках-64. Абсалютнай чэмпіёнкай свету сярод жанчын стала беларуска Вікторыя Нікалаева. Яна выйграла ўсе тры асабістыя турніры: класічную, хуткую і імгненную гульні. У мужчын залатыя медалі ў рапідзе і бліцы заваяваў Ігар Міхальчанка. Пераможцам у класічнай праграме стаў прадстаўнік Беларусі Андрэй Валюк. Прызёрамі чэмпіянату свету таксама сталі Аляксей Куніца, Вера Хвашчынская і Паліна Петрусёва. Удзел у сусветным першынстве ў Грузіі прынялі 54 спартсмены з 19 краін.

ТУРНІР ТЫДНЯ. У сталічным Палацы мастацкай гімнастыкі прайшоў XIX Міжнародны турнір на прызы алімпійскай чэмпіёнкі Марыны Лобач. Галоўны прыз турніра — імянную статуэтку алімпійскай чэмпіёнкі — заваявала Настасся Салас. Яна стала пераможцай у мнагабор'і, набраўшы па суме чатырох відаў 141,400 бала. Сярэбраны медаль дастаўся Аліне Гарнасько (141,150), бронза — у Лізаветы Зоркінай (134,950). У юніёрак наймацнейшай аказалася Дар'я Грахотава, якая апярэдзіла Аліну Рэчкіну і Ангеліну Ігнатаву з Санкт-Пецярбурга.

У групавых практыкаваннях не было роўных пецярбургскім гімнасткам, другое і трэцяе месцы занялі прадстаўніцы беларускіх клубаў РЦАП-1 і «Дынама». У камандных спаборніцтвах, дзе за кожную каманду выступалі па тры гімнасткі розных узростаў, перамог «Белы лотас» у складзе Ганны Каменшчыкавай, Аліны Рэчкінай і Нікі Рэзнік.

НАДЗЕІ ТЫДНЯ. Міжнародная асацыяцыя бокса (IBA) апублікавала сусветныя рэйтынгі баксёраў і краін. Арганізацыя ўвяла новую рэйтынгавую сістэму, згодна з якой спартсменам налічваюцца ачкі за выступленні на буйных міжнародных спаборніцтвах. Бягучы рэйтынг складзены па выніках Алімпійскіх гульняў у Токіа, двух апошніх чэмпіянатаў свету па боксе, а таксама па выніках кантынентальных першынстваў і турніраў Сусветнага баксёрскага тура. У адпаведнасці з дадзенай табліцай Беларусь займае 40-е месца сярод 119 краін.

Таксама ў сусветныя рэйтынгі ў сваіх вагавых катэгорыях увайшлі шэсць прадстаўнікоў нашай краіны. Аляксей Алфёраў займае 3-е месца ў катэгорыі да 80 кг, Яўген Кармільчык размяшчаецца на 4-й пазіцыі сярод баксёраў да 48 кг. Акрамя таго, Уладзіслаў Смяглікаў — 12-ы ў катэгорыі да 92 кг, Дзяніс Салоцкіх — 38-ы ў вазе да 51 кг, Кірыл Самадураў — 45-ы ў катэгорыі да 75 кг, Артур Туніеў — 48-ы ў вазе да 60 кг.

АБ'ЯВА ТЫДНЯ. Вызначаны 16 першых удзельнікаў Матчу зорак Кантынентальнай хакейнай лігі — 2022. Сярод іх — два хакеісты «Дынама-Мінск». Галкіпер Аляксей Коласаў і форвард Віталь Пінчук. Абодва хакеісты каманды згуляюць у Матчы ўсіх зорак КХЛ упершыню ў кар'еры. Матч Зорак КХЛ — 2022 пройдзе на арэне «Трактар» імя Валерыя Белавусава ў Чэлябінску 10 і 11 снежня.

ПАЗІЦЫІ ТЫДНЯ. Прадстаўлены абноўлены рэйтынг Жаночай тэніснай асацыяцыі. Першая ракетка Беларусі Арына Сабаленка апусцілася з чацвёртай на сёмую пазіцыю. На мінулым тыдні яна прайграла ў 1/16 фіналу турніру ў Гвадалахары. Цяпер у яе актыве 2970 ачкоў. Яшчэ адна беларуска Вікторыя Азаранка дайшла да паўфіналу спаборніцтваў у Гвадалахары і з 37-га ўзнялася на 27-е месца, набраўшы 1597 ачкоў. Аляксандра Сасновіч знаходзіцца на 31-м радку (1428 балаў).

У рэйтынгу Асацыяцыі тэнісістаў-прафесіяналаў (ATP) найлепшы з беларусаў Ілья Івашка на 72-м месцы (730 ачкоў), Егор Герасімаў займае 253-ю пазіцыю (203).

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота з адкрытых крыніц.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік у 13.48.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.56	17.50	9.54
Віцебск —	7.49	17.37	9.48
Магілёў —	7.46	17.41	9.55
Гомель —	7.39	17.41	10.02
Гродна —	8.10	18.06	9.56
Брэст —	8.07	18.10	10.03

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Івана, Кузьмы, Марціна, Мікалая.*
К. *Дар'і, Інгі, Пятра.*

Фота Настассі ГРУК.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

З вуліцы даносіцца: «Ляжаць! Ляжаць! Малайчына!»

Так. Я ляжу. Я малайчына.

— Я ведаю, што гэта глупства, што я прыспешваю падзеі, бо мы сустракаемся ўсяго тыдзень. Але, можа, расстанемся?

— Ты ж філасофскі скончыў?

— Ага.

— Гм. А якая ў філасофаў вытворчая практыка?

— Запой.

Конь у яблыках і гусь у яблыках — гэта два прынцыпова розныя лёсы!

Даты Падзеі Людзі

25 КАСТРЫЧНІКА

У краіне

1858 год — нарадзіўся (в. Пятровічы, цяпер у Смалявіцкім раёне) Эдуард Карлавіч Пякарскі, расійскі этнограф, географ, фальклярыст. Вучыўся ў Мінскай, Мазырскай і Чарнігаўскай гімназіях, Харкаўскім ветэрынарным інстытуце. У 1881 годзе за ўдзел у рэвалюцыйным руху быў сасланы ў Якуцію, дзе правёў больш за 23 гады ссылкі. Там яму давялося вывучаць якуцкую мову, запісваючы якуцкія словы з рускім перакладам. Праз чатыры гады ён прачытаў у газеце, што ў якуцкай мове налічваецца тры тысячы слоў, хоць асабісты слоўнік маладога вучонага ўключаў ужо сем тысяч, праз 11 гадоў — 20, а да 1930 года — 25 тысяч слоў. Слоўнікам Э. Пякарскага зацікавіўся Усходне-Сібірскі аддзел Рускага геаграфічнага таварыства, і ўжо ў 1899 годзе ў Якуцку выйшаў яго першы выпуск. Па запрашэнні Усходне-Сібірскага аддзела Рускага геаграфічнага таварыства навуковец удзельнічаў у экспедыцыі і Аяна-Нельканскай экспедыцыі 1903 года. А ў 1907-1918 гадах пад рэдакцыяй вучонага выйшлі 3 тамы «Узораў народнай літаратуры якутаў» на якуцкай мове. За «Слоўнік» і «Узоры літаратуры» вучонага ўзнагародзілі залатымі медалямі Акадэміі навук і Рускага геаграфічнага таварыства. На думку вучоных, «быў створаны не проста дапаможнік па якуцкай мове, а сапраўдная энцыклапедыя ўсяго ўкладу жыцця якуцкага народа, яго матэрыяльнай і духоўнай культуры». Заснавальнік пісьмовай якуцкай літаратуры А. Кулакоўскі назваў вучонага-беларуса «бацькам якуцкай літаратуры».

1932 год — нарадзіўся (в. Гасцілавічы Лагойскага раёна) Уладзімір Ігнатавіч Анісковіч, беларускі крытык, перакладчык. Складальнік-рэдактар серыі «Бібліятэка дзіцячай літаратуры народаў СССР», штогодніка «Парус». Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1947 год — нарадзіўся (пасёлак Рафалаў Брагінскага раёна) Уладзімір Мікалаевіч Белы, беларускі вучоны ў галіне оптыкі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН Беларусі. Аўтар навуковых прац па лінейнай і нелінейнай крышталяоптыцы, акустаоптыцы. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

1817 год — у Маскве на Вараб'ёвых гарах у прысутнасці імператара Аляксандра I закладзены храм Хрыста Збавіцеля па праекце А. Л. Вітберга.

1921 год — нарадзіўся Міхай I, кароль Румыніі, самы малады кавалер ордэна «Перамога».

1922 год — часці Народна-рэвалюцыйнай арміі Далёкаўсходняй рэспублікі пад камандаваннем Убарэвіча ўвайшлі ва Уладзівасток, што стала завяршэннем асноўнага тэатра грамадзянскай вайны ў Савецкай Расіі.

1929 год — біржавы крах 1929 года — абвальнае падзенне коштаў акцый у ЗША, якое пачалося ў Чорны чацвер 24 кастрычніка 1929 года і якое прыняло катастрафічныя маштабы ў чорную пятніцу (25 кастрычніка), Чорны панядзелак (28 кастрычніка) і Чорны аўторак (29 кастрычніка). Гэты біржавы крах, вядомы таксама як «крах Уол-стрыт», стаў пачаткам Вялікай дэпрэсіі і сусветнага эканамічнага крызісу 1929—1933 гадоў.

1962 год — Мікіта Хрушчоў у асабістым пасланні да прэзідэнта ЗША Джона Ф. Кенэдзі пагадзіўся вывесці з Кубы савецкія ракеты ў выпадку адмовы ЗША ад захопу Кубы і будучага вываду ракет з Турцыі.

Так гаварыў...

УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ:

«Мова, прыгожае пісьменства, паэзія, музыка — сродак сувязі між душамі людзей, вышэйшы сродак».

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў у тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2591.

Нумар падпісаны ў 19.30 24 кастрычніка 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12